

«ДЫРЫЖОР-ХУЛІГАН» БАБАРЫКІН

Сямейная газета



НОВЫЯ ДЭМАГРАФІЧНЫЯ ПАГРОЗЫ

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ЛЮТАГА 2021 г. ЧАЦВЕР № 21 (29390)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ЧАРАДНІЧЭНКА, намеснік міністра аховы здароўя:**

*«Міністэрства аховы здароўя гатова да любога дыялогу і любых прапаноў з боку ўсіх удзельнікаў фармрынку, таму мы ўпэўненыя, што неабгрунтаванага павышэння цэн на лекавыя прэпараты не будзе. Ажыццёўлены пэўныя дзеянні сумесна з МАРГ і іншымі зацікаўленымі ведамствамі па распрацоўцы і прыняцці адпаведных мер. У прыватнасці, кіраўніцтвам Міністэрства аховы здароўя праведзены сустрэчы з прадстаўнікамі Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў, айчынных кампаній, адбылася сустрэча з дыстрыб'ютарамі, прадстаўнікамі буйных аптэчных сетак. Мы знайшлі агульныя падыходы і ўбачылі разуменне (з боку і фармбізнесу, і айчынных вытворцаў) важнасці той праблемы, якая на гэты момант існуе. І ўсе выказалі зацікаўленасць у тым, каб яе вырашыць».*

## КОРАТКА

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пагаварыў па тэлефоне са старшынёй Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі, кіраўніком фракцыі Кампартыі ў Дзяржаўнай думе Федэральнага сходу Генадзем Зюганавым.

ISSN 1990 — 763X

21021

# Яркія фарбы клопату

У Гродне ў маладым жылым раёне Грандзічы на поўначы абласнога цэнтра пачаў работу новы дзіцячы садок. Новабудоўля разлічана на 230 месцаў. Сярод навасёлаў — выхавальніца Галіна КУХТА і яе маленькія падапечныя.





Фота БелТА.

Чалавек справы




## «ЭКАФЕРМА» І КАЛЯРОВЫЯ ЯЙКІ

**Якое ноу-хау ўкараняюць на Салігорскай птушкафабрыцы**

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Салігорская птушкафабрыка» — адно з самых вялікіх і паспяховых у краіне. Невыпадкова яго дырэктара ААТ Іну ТАЛКАЧОВУ абралі дэлегатам на Усебеларускі народны сход. Але, як прызнаецца кіраўнік, на прадпрыемстве хапае і праблем.**

**— Між іншым, мы не спыняемся, рухаемся наперад. Купляем новае абсталяванне за кошт уласных сродкаў — ніхто нам не дапамагае. За ўсю гісторыю існавання прадпрыемства, а ў лютым яму спаўняецца 50 гадоў, толькі аднойчы выдзелілі льготны крэдыт для будаўніцтва птушніка для маладняку. Усё астатняе ўзвялі за свой кошт без дзяржаўнай падтрымкі. І калектыў гэтым ганарыцца, таму што такіх прадпрыемстваў не так шмат у краіне, — кажа Іна Талкачова.**

За 11 месяцаў мінулага года фабрыка спрацавала з чыстай рэнтабельнасцю ў 6 %. Гадавы баланс па канчатковым фінансавым выніку яшчэ падводзіцца. У 2018-м гэты паказчык склаў 5,4 %, у 2019-м — 5,7 %. Здавалася б, мінулы год складаны для ўсіх вытворцаў, але харчавікі ўсё ж такі аказаліся ў больш выгадных умовах. Як той казаў, не было б шчасця, ды няшчасце памагло — птушкафабрыка адкрыла новыя рынкі збыту. Справа ў тым, што Беларусь у савецкія часы мела сельскагаспадарчы профіль. Таму і птушкафабрыкі будаваліся з перспектывай на павелічэнне выпуску прадукцыі. Іх стала вельмі шмат, і сёння забяспечанасць беларусаў яйкамі складае прыблізна 130 %. Натуральна, лішак трэба прадаць. Расійская Федэрацыя была і застаецца асноўным спажыўцом дадзенай прадукцыі. На жаль, па цане сёння ёсць вялікае пытанне. Пры пастаўцы на замежныя рынкі беларускія вытворцы нясуць страты.

СТАР. 2

Прыкметы часу

## ПРАВІЛЫ «МАСКІРОЎКІ»

Ці выконваюць масачны рэжым у самым буйным горадзе краіны?




**Маскі нам насіць яшчэ доўга. Згодна з прагнозамі медыкаў, масачны рэжым будзе захоўвацца, хутчэй за ўсё, аж да чэрвеня. Але ці выконваецца гэтая мера засцярогі не на паперы, а ў жыцці? Прагуляемся па Мінску, каб гэта высветліць.**

СТАР. 13

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Для ўсіх нас вельмі важна»

**На нарадзе па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення VI Усебеларускага народнага сходу Прэзідэнт паведаміў, што даўно прыняў рашэнне аб маштабным сацыялагічным даследаванні ў Беларусі.**

«Тады было даручэнне, каб мы гэтыя сацыялагічныя даследаванні закончылі да Усебеларускага народнага сходу і паставілі там (у апытанні. — **«Зв.»**) для адказу людзям канкрэтныя пытанні, ад якіх залежыць развіццё нашай Беларусі, якія хвалююць людзей, — сказаў ён. — Гэтыя сацыялагічныя даследаванні пачаліся. Даследавалі частку гарадоў, працоўных калектываў асобных і гэтак далей».

У найбліжэйшыя дні пройдуць апытанні жыхароў вёсак, малых гарадоў, раённых цэнтраў і асобных прадпрыемстваў, дадаў беларускі лідар і папрасіў удзельнікаў даследавання адказваць на пытанні аб'ектыўна і шчыра.

«Для мяне асабіста гэта вельмі важна, — сказаў ён. — Для ўсіх нас вельмі важна, каб мы маглі прыняць добрае, нармальнае, выверанае рашэнне. Ананімнасць гарантую цалкам».

Апошнім часам людзі, з-за таго, што іх асабістыя даныя трапілі ў глабальную сетку Інтэрнэт, публічна выказвацца не хочуць, дадаў Прэзідэнт.

«Таму апытанне будзе персанальнае, і поўная ананімнасць», — паўтарыў ён.

Прадстаўнікі сацыялагічных службаў будуць вельмі сумленныя людзі, запэўніў Аляксандр Лукашэнка і паабяцаў, што вынікі даследавання апублікуюць.

«Галоўны даследчык — замежная кампанія, — звярнуў ён увагу і прапанаваў падключыць да апытання расіян, украінцаў і іншых, хто пажадае. — Так, будуць сацыёлагі і беларускія, але яны не павінны быць галоўныя, каб быў давер да сацыялагічнага даследавання ўсіх груп насельніцтва».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «ЭКАФЕРМА» І КАЛЯРОВЫЯ ЯЙКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Выключэннем можна назваць толькі гэты год, таму што цэны з улікам недахопу яек крыху павысіліся. Перад нашымі спецыялістамі была пастаўлена задача шукаць новыя рынкі збыту, з тым, каб выйсці на прыбытковую работу. Адыграла сваю ролю і пандэмія. У 2019-м рост экспарту да ўзроўню 2018-га быў 53 %. У 2020-м мы прыраслі да гэтага яшчэ сямю працэнтамі. Сёлета пашырылі геаграфію паставак. Нашымі новымі спажыўцамі сталі Кіргізія, Казахстан, Азербайджан, Узбекістан, краіны Персідскага заліва, Афрыкі. Там задаволены нашай прадукцыяй, таму што мы карпатліва сочым за якасцю, рацыёнам птушкі, асартыментам, — лічыць Іна Талкачова. — Усё, што з'яўляецца на рынку з новага, — гэта наша ноу-хау.

У прыватнасці, на птушкафабрыцы запускаюць новы праект — «Экаферма». Яйкі будуць атрымліваць ад дамашніх парод курэй з розным апярэннем. Тыя будуць даваць яйкі ад светла-зялёнага колеру да ружовага і цёмна-карычневага — амаль шакаладнага. Птушка будзе мець магчымасць выгулу ў летні час. Зразумела, што ў яе будуць іншы рэжым і рацыён, курам будуць даваць травяную муку, каб максімальна наблізіць іх утрыманне да хатніх умоў. Сёння ва ўсім свеце распаўсюджана тэндэнцыя да правільнага, экалагічнага харчавання, здаровага спосабу жыцця.

По ўзроўню зарплаты Салігорская птушкафабрыка на шостым месцы ў раёне сярод прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці. За 2020 год сярэд-



ні заробак склаў 1809 рублёў. А ад кожнай нясушкі атрымана па 330 яек. У сярэднім па краіне паказчык усіх узятых разам птушкафабрык — 299,7. Таксама на прадпрыемстве расход корму на дзясятак атрыманых яек — 1,28 адзінкі, пры сярэднім агульнарэспубліканскім — 1,41. Гэтыя паказчыкі ўплываюць на эканоміку прадпрыемства і даюць магчымасць не спыняцца, развівацца далей. Першае месца ў краіне займае фабрыка і па вытворчасці перапяліных яек. Тут утрымліваецца 350 тысяч перапёлак-нясушак, а з улікам маладняку — паўмільёна.

Што датычыцца мадэрнізацыі, то яна ідзе пастаянна і скіравана на выпуск новай прадукцыі. У 2003 годзе абагацілі селенам яйкі, якія ідуць пад брэндамі «Маладзецкія». Затым ад «Санта-Брэмар» паступіў запыт на вараныя яйкі для дабаўлення ў салаты. У 2006 годзе на фабрыцы купілі спецыяльную машыну еўрапейскай вытворчасці для гэтых мэт. Ды кампанія адмовілася ад задумы — канчатковы прадукт атрымліваўся дарагі. Але спажывец быў гатовы да такога прадукту. У 2019-м набылі другую машыну, якая варыць 20 тысяч яек у гадзіну. Для лепшага захоўвання яны знаходзяцца ў марынадзе. 85 % гэтай прадукцыі ідзе на экспарт. Салігорская птушкафабрыка — яшчэ і адзіны вытворца вэнджаных яек. Тут пачалі варыць і вэндзіць і перапяліныя, пакуль на прыстасаваным абсталяванні. У планах на гэты год — пакупка спецыяльнай машыны па ачыстцы і варцы перапяліных яек, таму што попыт на іх расце. У асноўным прадукцыю пастаўляюць за мяжу. Выпускаюць яе ў пластыкавых вядзерцах, ва ўпакоўцы, маленькіх шкляных слоіках.

На прадпрыемстве працуюць 424 чалавекі. Сацыяльны пакет тут адзін з найлепшых. Работнікам гарантаваныя грошы на аздараўленне, гэта, лічы, яшчэ адны «адпускныя». Другі год дзейнічае медыцынская страхоўка за кошт прадпрыемства, любы ахвотны можа прайсці медыцынскае абследаванне. Кожныя паўгода тут праводзяць ушанаванне юбіляраў вытворчасці. Людзі трымаюцца сваёй работы — умовы добрыя, зарплата дастойная. Ёсць таксама свой медпункт з сучасным абсталяваннем. На тэрыторыі працуе сталовая, для работнікаў ёсць скідка на харчаванне — 45 %. Пропуск з'яўляецца адначасова і разліковай карткай, на якую бухгалтэрыя залічвае пэўную суму. Ёй можна разлічыцца і ў фірменнай краме, што знаходзіцца на тэрыторыі птушкафабрыкі. Гэта вельмі зручна — тут пасля работы чалавек можа купіць дадому неабходныя прадукты.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

Разам

# Канструктыўны дыялог з моладдзю

Улада імкнецца выбудаваць з маладымі людзьмі дыялог, таму што канструктыўная гутарка, у адрозненне ад спрэчкі, лепш здольная вырашыць наспелыя праблемы. Такое меркаванне выказаў **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН** падчас адкрытага дыялогу з удзелам дэлегатаў VI Усебеларускага народнага сходу ад Мінска, передае карэспандэнт БелТА.

«Улада ведае актуальныя праблемы, якія хвалююць маладых людзей. Мы заўсёды цікавіліся меркаваннем падрастаючага пакалення і імкнуліся вырашаць цяжкасці, якія ў іх узнікаюць. Маладыя здольныя прапанаваць нешта якасна новае, — сказаў Арцём Цуран. — Ёсць старажытная фраза, што ісціна нараджаецца ў спрэчцы, але я лічу, што канструктыўны дыялог здольны больш якасна вырашыць вострыя пытанні, таму ўлада зацікаўлена ў зносінах з маладымі людзьмі».

Падчас адкрытага дыялогу з удзелам дэлегатаў ад Мінскага гарадскога камітэта БРСМ абмяркоўваліся прапановы па ўдасканаленні форуму, асноўныя напрамкі і параметры развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы ў дзяржаве. «Усебеларускі народны сход — падзея неверагодна важная. Гэты вялікі форум аб'ядае грамадзян краіны ў дыялогу, які дазволіць вызначыць асноўныя шляхі развіцця нашай краіны на найбліжэйшыя гады. Кансалідацыя народа дазволіць даведацца, што трэба зрабіць, каб краіна развівалася, а не стаяла на месцы», — падзялілася меркаваннем **намеснік дырэктара па рэкламе прадпрыемства «Мінскрэклама» Марына ГРЫЦАВА.**

Таксама ад маладых дэлегатаў VI Усебеларускага народнага сходу гучалі просьбы разгледзець пытанні першага рабочага месца, узроўню заробатнай платы, умоў працы і жыллёвых умоў, а таксама прапановы па папулярызацыі дзяржаўнай сімволікі.

Энергетыка

# КЛУБ ТРЫЦЦАЦІ ТРОХ

## Беларусь рыхтуецца стаць атамнай дзяржавай

**Сістэма ядзернага права фарміруецца ў Беларусі, пакуль разнастайныя структуры краіны рыхтуюцца да прыёму Беларускай АЭС у камерцыйную эксплуатацыю. Будзе распрацаваны новы класіфікатар, які ўключае ў сябе асобныя кірункі ядзернага права. Да адказнага рашэння па прыёме станцыі ў прамысловую эксплуатацыю плануецца грамадскае слуханне і шэраг іншых інфармацыйных мерапрыемстваў, расказалі эксперты Дзяржатамнагляду падчас брыфінгу ў БелТА.**

### ЧАТЫРЫ КАМПАНЕНТЫ ЯДЗЕРНАЙ БЯСПЕКІ

Беларусь падышла да змены статусу краіны-навічка ў атамнай справе на краіну, якая мае дзеючую атамную станцыю, і ў свеце мы станем 33-й такой дзяржавай.

*— Фарміраванне рэгулюючай інфраструктуры ў краіне было выбудавана на падставе міжнародных падыходаў. Існуе шэраг нарматыўных тэхнічных і кіруючых дакументаў па лініі МАГАТЭ, дзе сказана, як мае быць пройдзены дадзены шлях, каб краіна магла ў поўным аб'ёме рэгуляваць гэтую адказную дзейнасць,* — заўважыла **Вольга ЛУГОЎСКАЯ, начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях (Дзяржатамнагляд).** *— Ступені, якія краіна павінна прайсці, каб гэтая інфраструктура была сфарміравана, распісаны ў Кіраўніцтве па бяспецы МАГАТЭ № SSG-16. Існуюць чатыры кампаненты глабальнага рэжыму ядзернай бяспекі, якімі павінна валодаць краіна, каб стаць членам «Клуба 33-х».*

Найперш гэта далучэнне да дагаворна-прававых дакументаў накшталт канвенцый і кодэксаў.

Другі кампанент — усеахопны комплекс норм ядзернай бяспекі, які ўвасабляе ўзорную практыку ў якасці арыенціру для забеспячэння высокага ўзроўню бяспекі ядзернай дзейнасці. Гэта ўключае ў сябе нормы і правілы, якія сфармуляваныя МАГАТЭ і з'яўляюцца асновай для фармулявання сваёй сістэмы нарматыўна-прававых дакументаў у краіне з АЭС.

Трэці — нацыянальная інфраструктура ў цэлым і фарміраванне глабальнай суполкі экспертаў.

Чацвёрты — выкарыстанне комплексу міжнародных паслуг у галіне бяспекі. Гэта так званыя экспертныя місіі, запрашэнне якіх у краіну — неад'емная частка работы, што будзе працягвацца, каб сфарміраваць паўнавартасную інфраструктуру.

### БЯСПЕКА ЯДЗЕРНЫХ АДХОДАЎ І ЗАБАРОНА НА ЗБРОЮ

Далучэнне да дагаворна-прававых дакументаў — адзін з першых крокаў, якія павінна зрабіць краіна, якая толькі плануе ядзерную дзейнасць. І ў гэтым дачыненні Беларусь з'яўляецца адным з прыкладаў для іншых краін, адзначыў **Алег СОБАЛЕЎ, кансультант Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі (Дзяржатамнагляд):**

*— На момант прыняцця рашэння аб будаўніцтве АЭС (2007 год) краіна ўжо была дагаворным бокам шэрагу міжнародных канвенцый і пагадненняў, якія закранаюць* пытанні ядзернай бяспекі.

Іх досыць шмат, але эксперт спыніўся на трох канвенцыях, за выкананне якіх непасрэдна адказвае Дзяржатамнагляд. Гэта Канвенцыя аб ядзернай бяспецы, Аб'яднаная канвенцыя аб бяспецы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам і Пагадненне паміж Беларуссю і МАГАТЭ аб прымяненні гарантый у сувязі з дагаворам аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі.

З падпісаннем і ратыфікацыяй гэтых канвенцый краіна бярэ на сябе шэраг абавязкаў. Напрыклад, стварыць незалежны рэгулюючы орган, праводзіць рэгулярную (раз у тры гады) самаацэнку ў выглядзе нацыянальных дакладаў, удакладніў эксперт:

*— Па Канвенцыі аб ядзернай бяспецы такі даклад быў падрыхтаваны ў жніўні 2019-га і перададзены ў МАГАТЭ. Па Аб'яднанай канвенцыі даклад зроблены ў кастрычніку 2020-га. Усе даклады змяшчаюцца на спецыяльным сайце, і ўсе краіны могуць вывучаць іх. А вынік вывучэння — пастаноўка пытанняў і каментарыяў да дакладаў іншых дзяржаў. Да нашага даклада па Канвенцыі аб ядзернай бяспецы паступіла, напрыклад, 239 пытанняў. Больш атрымалі толькі Расія, Кітай і Фінляндыя. Пасля пытанняў была фаза адказаў, якія Беларусь дала.*

Усе гэтыя фазы падрыхтоўкі пытанняў і адказаў завяршаюцца нарадай дагаворных бакоў, якая адбываецца ў штаб-кватэры МАГАТЭ ў Вене. На ёй падводзіцца вынік, наколькі за тры гады кожная краіна выканала свае абавязкі ў межах канвенцый. У ім абазначаюцца выклікі, з якімі дзяржавам трэба папрацаваць наступныя тры гады, а таксама падкрэсліваюцца існуючыя станоўчыя кірункі паспяховай работы, каб імі маглі скарыстацца іншыя краіны.

Абавязкі краіны адносна Пагаднення аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі досыць простыя. Ядзерны матэрыял, які знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, будзе выкарыстоўвацца толькі ў мірных мэтах і ні ў якім разе не для вырабу зброі. Каб упэўніцца, што гэта будзе сапраўды выконвацца, у рэспубліцы існуе нацыянальная сістэма ўліку і кантролю.

### АЦЭНАЧНЫЯ МІСІІ

Наша краіна практычна штогод прымае групы экспертаў з МАГАТЭ, адзначыў **Аляксандр ДАКУЧАЕЎ, намеснік начальніка Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі (Дзяржатамнагляд):**

*— Амаль кожная місія адзначае станоўчыя практыкі ў Беларусі. Гэта азначае, што эксперты ўпершыню ўбачылі, як арганізавана ў нашай краіне тое ці іншае пытанне, якое можна рэкамендаваць выкарыстоўваць і ў іншай краіне.*

*— Як правіла, мы ўсё выконваем у час, адставанняў няма, і работа ацэньваецца досыць высока,* — падкрэсліў Аляксандр Дакучаеў. *— Мы вывучаем вопыт усяго свету і практычна з усімі краінамі ядзернага клубу 33-х маем добрыя адносіны.*

**Ірына СІДАРОК.**

Ва ўрадзе

# Кааперацыя для аднаўлення эканомікі

**Беларусь і Расія абавязана выходзіць на новы ўзровень прамысловай і навукова-тэхнічнай кааперацыі, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА на сустрэчы з віцэ-прэм'ерам Расіі Юрыем БАРЫСАВЫМ, перадае БелТА.**

«Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі і ўвядзення рознымі краінамі палітычных, эканамічных абмежавальных мер мы ўпэўнены, што менавіта супрацоўніцтва і прамысловая кааперацыя будуць тым падмуркам, на якім нам трэба будзе далей развіваць узаемадзеянне. І рэаліі такія, што мы абавязаныя, на мой погляд, выходзіць на новы ўзровень прамысловай і навукова-тэхнічнай кааперацыі», — адзначыў беларускі прэм'ер.

Умацаванне і развіццё супрацоўніцтва з Расіяй ён назваў для Беларусі прыярытэтным кірункам і дадаў, што эканомікі нашых краін пачынаюць аднаўляцца пасля шокаў, звязаных з пандэміяй.

«Радуе, што працэс ідзе сінхронна, умацаванне эканамічнага развіцця назіраецца ў абедзвюх краін, і гэта вельмі важна, таму што Расія была, застаецца і, я ўпэўнены, будзе нашым ключавым партнёрам у ваенна-тэхнічнай, прамысловай, навукова-тэхнічнай сферах», — сказаў Раман Галоўчанка.

❍ У ТЭМУ

**Аднаўляюцца чыгуначныя зносіны і павялічваецца колькасць авіярэйсаў паміж Расіяй і Беларуссю. Адпаведнае рашэнне падпісана прэм'ер-міністрам Расіі Міхаілам Мішусціным, паведамляе БелТА.**

**«З 8 лютага 2021 года на ўзаемнай аснове будуць адноўлены пасажырскія чыгуначныя зносіны з Беларуссю па маршруце Мінск—Масква—Мінск і па маршруце Масква—Калінінград, Калінінград—Санкт-Пецярбург з прыпынкам цягнікоў у Мінску. З 8 лютага на ўзаемнай аснове будзе павялічана колькасць рэгулярных авіярэйсаў Масква—Мінск з трох да пяці ў тыдзень, а таксама адноўлены на ўзаемнай аснове паветраныя зносіны з Растова-на-Доне і Санкт-Пецярбурга ў Мінск па адным рэйсе ў тыдзень з кожнага аэрапорта», — гаворыцца ў паведамленні.**

Візіт

# ДЗЕЛЯ ЗАХАВАННЯ ЗДАРОЎЯ

## Для беларускіх медыкаў перададзена новая расійская вакцына «Эпіваккарона»

**У Мінску з афіцыйным візітам знаходзіцца дэлегацыя Федэральнай службы Расіі па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека Расіі (Расспажыўнагляд) на чале з кіраўніком службы, галоўным дзяржаўным санітарным урачом Расіі Ганнай ПАПОВАЙ. Учора яна сустрэлася з прэм'ер-міністрам Беларусі Раманам ГАЛОЎЧАНКАМ.**

— Санітарныя службы нашых дзяржаў знаходзяцца ў цесным і плённым кантакце з самага пачатку пандэміі. Вядома, распаўсюджванне каранавіруснай інфекцыі наклала глыбокі адбітак на эканоміку нашых краін, камунікацыі. Усё гэта негатыўна паўплывала на вынікі гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, — адзначыў Раман Галоўчанка.

Паводле яго ацэнкі, сёння дзякуючы скаардынаваным намаганням ёсць пазітыўныя тэндэнцыі ў пераадоленні наступстваў пандэміі.

Па словах Ганны Паповай, цяпер спецыялісты Беларусі і Расіі абмяркоўваюць праявдзенне сумесных навуковых даследаванняў, звязаных з COVID-19.

— Першае — гэта вывучэнне папуляцыйнага імунітэту ў Беларусі. Такі праект у Расійскай Федэрацыі праходзіць вельмі паспяхова, мы разумеем, якая колькасць насельніцтва ў Расіі мае імунітэт да COVID-19, — адзначыла Ганна Папова. Паводле яе слоў, даныя аб папуляцыйным імунітэце дазваляюць прагназаваць далейшую эпідэмічную сітуацыю. Яшчэ адна ініцыятыва, якая абмяркоўваецца — гэта работа па маніторынгу зменлівасці віруса на тэрыторыі Беларусі. У Расіі яна ідзе досыць даўно.

Ганна Папова перадала Беларусі новую вакцыну ад каранавіруса «Эпіваккарона». «У якасці жэсту нашага вялікага сяброўства я перадала беларускім калегам новую вакцыну «Эпіваккарона», якая, я ўпэўнена, паслужыць захаванню здароўя медработнікаў, што знаходзяцца ў зоне рызыкі. Акрамя таго, мы перадалі тэст-сістэму новага пакалення для вызначэння віруса», — распавяла яна.

Раней у Расспажыўнаглядзе паведамлялі, што па выніках першай-другой фаз клінічных выпрабаванняў імуналагічная эфектыўнасць вакцыны «Эпіваккарона» складае 100 %. Маштабны выпуск вакцыны плануецца пачаць у лютым.

**Міністр аховы здароўя Беларусі Дзмітрый ПІНЕВІЧ** даў высокую ацэнку новай расійскай вакцыне:

— Мы, вядома, спадзяёмся, што гэта вакцына будзе пастаўлена ў большай колькасці, і яна дапаможа ў комплексным супрацьдзеянні каранавіруса. Гэта вельмі добрая вакцына, ацэньваецца вельмі высока, — адзначыў ён. Па словах міністра аховы здароўя Беларусі, бакі таксама абмеркавалі праграмы вакцынацыі ў абедзвюх краінах.

Міністр таксама распавёў пра сітуацыю з COVID-19.

— Мы канстатуем стабілізацыю эпідпрацэсу ў Беларусі і Расіі. Зразумела, што Беларусь значна меншая краіна, але ва ўсіх рэгіёнах краіны эпідпрацэс паказвае больш нізкую інтэнсіўнасць, — сказаў Дзмітрый Піневіч.

Таксама на сустрэчы ў беларускім урадзе абмяркоўвалася ўзаемадзеянне з Расіяй у вытворчасці і выкарыстанні вакцын супраць каранавіруса. Гаворка ідзе не толькі пра «Спадарожнік V», але і пра іншыя расійскія распрацоўкі. Акрамя таго, абмяркоўвалася ўзаемадзеянне Беларусі і Расіі пры перасячэнні мяжы з выкарыстаннем мабільнай праграмы «Падарожнічаю без COVID-19».

Адзначым, што ў межах праграмы візіту намеснік міністра — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Аляксандр Тарасенка пазнаёміў расійскіх калег з работай РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі ва ўмовах пандэміі COVID-19.

**Алена КРАВЕЦ.**

Класныя навіны

# Харчаванне дзяцей — па новых нормах

**У Беларусі павялічаны грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне ва ўстановах адукацыі. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 1 лютага 2021 года № 61.**

Так, дзённыя грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне на аднаго выхаванца ў яслях, яслях-садках, дзіцячых садках, дашкольных цэнтрах развіцця дзіцяці павялічаны да 2,75—4,3 рубля (раней было 2,5 — 3,91 рубля) у залежнасці ад узросту дзіцяці і працягласці яго знаходжання ў дашкольнай установе.

Выдаткі на харчаванне ў санаторных яслях-садках, санаторных дзіцячых садках, санаторных групах з працягласцю знаходжання 12—24 гадзіны павялічацца да 4,13 рубля для дзяцей ва ўзросце адзін-два гады і да 4,97 рубля ва ўзросце ад трох да шасці гадоў. Да гэтага яны складалі 3,72 і 4,69 рубля адпаведна.

Нормы харчавання навучэнцаў у пачатковых, базавых, сярэдніх школах, гімназіях і ліцэях павялічацца з 2,67 да 2,86 рубля.

Вырастуць таксама грашовыя нормы расходаў на харчаванне ўдзельнікаў адукацыйных мерапрыемстваў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кошт нафты вырас да гадавога максімуму



Каціроўкі ф'ючарсаў на нафту ўзраслі да максімальных адзнак больш чым за год. Уплыў на рынак аказалі чаканні ўдзельнікаў, што намаганні вядучых вытворцаў па зніжэнні здабычы «чорнага золата» прывядуць да скарачэння яго прапановы. Таксама рост цэн на вуглевадародную сыравіну падтрымала рашэнне Саудаўскай Аравіі, якая мае намер скарацiць здабычу на мільён барэляў у дзень да канца сакавіка, адзначаецца ў апошнім аглядзе Sevens Report Research. «Акрамя таго, зніжэнне колькасці заражэнняў каранавірусам, распаўсюджванне вакцын, а таксама надзеі на стымуляванне павышаюць ацэнкі перспектыў попыту ў найбліжэйшыя месяцы і кварталы», — падкрэсліваецца ў аглядзе. Аналітыкі Sevens Report Research тлумачаць, што цяпер цэны на нафту «знаходзяцца ў добра сфарміраваным павышальным трэндзе, што пры адсутнасці фундаментальных сюрпрызаў дазволіць ім нацэліцца на адзнаку ў $60 за барэль».

## Джэф Безас пакідае пасаду кіраўніка Amazon

Генеральны дырэктар Amazon Джэф Безас пакідае ключавую пасаду ў кампаніі, заснаванай ім у гаражы 30 гадоў таму. Гэты крок, паводле яго слоў, дасць яму час і сілы, каб заняцца іншымі ініцыятывамі. Безас, найбагацейшы чалавек на планеце, саступіць сваю пасаду Эндзі Джасі, які кіруе ў кампаніі аддзелам воблачных вылічэнняў. Змена адбудзецца ў другой палове 2021-га, зрэшты, Безас пакідае за сабой пасаду выканаўчага старшыні Савета дырэктараў. «Я ніколі не быў настолькі поўны сіл, і аб сыходзе на спачынак не можа быць і гаворкі», — заявіў 57-гадовы прадпрымальнік. Безас заснаваў Amazon у 1994 годзе як кніжную анлайн-краму. Сёння ў кампаніі працуе каля 1,3 млн чалавек ва ўсім свеце, а летась на хвалі пандэміі, калі многія людзі пераключыліся на пакупкі ў інтэрнэце, справы рэзка пайшлі ўгару. У 2020-м продажы на Amazon перавалілі за 386 млрд долараў, што на 38 % больш, чым годам раней, а даходы амаль удвоіліся.



## У Ізраілі археолагі выявілі біблейскі царскі пурпур



Ізраільскія археолагі выявілі ў даліне Цімна непадалёк ад Эйлата фрагмент тканіны, які адносіцца да першага тысячагоддзя да н. э., дакладней, да часу завявання біблейскім царом Давідам Ідумейскага царства. Гэты артэфакт жалезнага веку быў афарбаваны ў так званы каралеўскі пурпур. Так называўся вельмі ўстойлівы і дарагі фарбавальнік, ён шанаваўся на вагу золата і асацыяваўся з вышэйшай знацю і святарамі. Паводле слоў спецыяліста па антычных часах доктара Наамы Сукенік, гэта самы ранні вядомы ўзор такой тканіны ва ўсім Паўднёвым Леванце. Сваім пурпуровым колерам тканіна была абавязаная тром відам малюскаў, якія жывуць у Міжземным моры. Не выключаецца, што менавіта з такой тканіны магло быць пашыта адзенне самога цара Саламона.

Спорт

# Колькасць медалёў на пяцігодку

## Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.01.2021 № 54 зацверджана Дзяржаўная праграма «Фізічная культура і спорт» на 2021—2025 гады

Згодна з дзяржаўнай праграмай, спартыўны рэйтынг Беларусі ў неафіцыйным камандным заліку па выніках Алімпійскіх гульнях не павінен апускацца ніжэй за 25-е месца. Колькасць медалёў на Алімпійскіх гульнях, Еўрапейскіх гульнях, чэмпіянатах, кубках, першынствах свету і Еўропы ў 2021 годзе павінна скласці не менш за 695, у 2025-м — не менш за 715.

Плануецца, што фізкультурай і спортам у 2025-м будуць займацца 26,8 % беларусаў. Фізкультурай і спортам зараз займаецца 2,37 мільёна чалавек, ці 24,8 % насельніцтва. Для параўнання, у 2015 годзе гэты паказчыкаў раўняўся 20,2 %.

Дзяржаўная праграма прадугледжвае будаўніцтва і рэканструкцыю шэрагу аб'ектаў пры ўмове прыцягнення сродкаў. З 2021-га да 2024 года плануецца мадэрнізаваць па 40 комплексных спартыўных пляцовак на дваравых тэрыторыях. Напрыклад, у Брэсце могуць быць пабудаваны лядовая арэна, адкрыты веласіпедны трэк, спецыялізаваны спортзал для індархакея. У Віцебску з'явяцца новыя тэнісныя корты, гульнявая зала, басейн, крытая лядовая трэніровачная пляцоўка. Спартыўная інфраструктура Гродна папоўніцца тэніснымі кортамі і ўніверсальным спарткомплексам для гульнявых відаў спорту. Будаўніцтва фізкультурна-аздараўленчых комплексаў прадугледжана ў Дзяржынску, Фаніпалі, Старых Дарогах, Уздзе, Нясвіжы і іншых гарадах. Рэканструкцыя спартыўных аб'ектаў закране многія гарады краіны, у прыватнасці, Баранавічы, Пінск, Шуміліна, Наваполацк, Глыбокае, Мёры, Паставы. Аднаўленне прадугледжана і для сталічных спартыўных арэн — спарткомплексу «Дынама» на вуліцы Даўмана. Пры ўмове прыцягнення сродкаў запланавана будаўніцтва модульнага басейна ў раёне «Чыжоўка-Арэны», будаўніцтва стадыёна СДЮШАР па спартыўнай гімнастыцы і акрабатыцы.

Агульны аб'ём фінансавання дзяржаўнай праграмы — больш за Br3,8 млрд. Сродкі рэспубліканскага бюджэту складуць Br1,26 млрд, сродкі мясцовых бюджэтаў — Br2,1 млрд.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Слова — дэлегату




# «Галоўнае — не спыняцца на дасягнутым»


grazeta.by.

**Так лічыць старшыня СВК імя Дзяншчыкова Васіль СВІРЫД. Вось ужо 40 гадоў ён узначальвае адну з самых паспяховых і моцных гаспадарак не толькі Гродзеншчыны, але і краіны. Сельгаскааператыў з'яўляецца адноўленай галіновай арганізацыяй краіны па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці сельгаспрадукцыі і павышэнні эканамічнай эфектыўнасці вядзення гаспадаркі. Вопытны кіраўнік бачыць і новыя магчымасці аграпрамысловага комплексу. У прыватнасці, наладзіць цесныя сувязі.**

— Сельская гаспадарка развіваецца даволі паспяхова, хуткімі тэмпамі, але, нягледзячы на дасягненні, галіна, на мой погляд, мае патрэбу ў дадатковай увазе. Трэба намацваць і ліквідаваць «падводныя камяні», — упэўнены дэлегат.

Адным з такіх «камянёў», на думку Васіля Свірыда, з'яўляецца перапрацоўка. Пакуль сельгасвытворцы і перапрацоўчыкі сыраваны не заўсёды дзейнічаюць супольна. Трэба, каб яны аб'ядналіся, разам фарміравалі закупачныя цэны. Напрыклад, у вытворчасці цукровых буракоў. Нізкія закупачныя цэны робяць гэтую культуру нявыгаднай для вытворцаў. Між тым у краіне, згодна з праектам Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, стаіць задача павялічыць вытворчасць гэтай сельгаскультуры на 17 % за пяцігодку.

— Яшчэ адна важная задача — навучанне кадраў. Мы ў сваёй гападарцы ўпэніліся, наколькі сучасна падрыхтаваны спецыяліст садзейнічае руху наперад. У нас хапае кваліфікаваных кадраў, якія пастаянна павышаюць свой прафесійны ўзровень. Нашы спецыялісты шмат ездзілі за мяжу, у тым ліку ў ЗША, Францыю, Ізраіль, Германію, Польшчу. З вопыту гэтых краін мы імкнёмся браць самае лепшае. Калі не карыстацца напрацоўкамі перадавых краін, можна доўга таптацца на месцы, — адзначае Васіль Свірыд.

У гаспадарцы першаснае значэнне надаецца тэхнічнаму аснашчэнню, а таксама развіццю ўласнай перапрацоўкі. У кааператыве ёсць свае цэхі і крамы. Значным дасягненнем стала будаўніцтва камбікормавага цэха, прадукцыйнасцю 10 тон вырабаў у гадзіну. Высакаякасныя кармы дазваляюць атрымаць і высокую прадукцыйнасць у жывёлагадоўлі. Гаспадарка — лідар у малочнай галіне рэгіёна. Высокія паказчыкі забяспечваюцца прафесіяналамі сваёй справы. Тыя атрымліваюць добрую зарплату, у гаспадарцы будуецца жыллё, таму цякучасці кадраў тут няма. Калі вытворцы атрымаюць дадатковыя прэферэнцыі, яны змогуць даць яшчэ больш запатрабаванай прадукцыі. Галоўнае — не спыняцца на дасягнутым, лічыць дэлегат.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Дыялогавая пляцоўка

# ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАБЕЛЫ

## У Мінску абмеркавалі пытанні развіцця адукацыі

«Неабходна бачыць, чуць і сур'ёзна аналізаваць усё, што прапануе моладзь. Погляд людзей, не абмежаваных пэўнымі стэрэатыпамі, часам бывае вельмі правільны і карысны. Уся наша сістэма накіравана на тое, каб максімальна рэалізаваць патэнцыял маладых людзей, выявіць адораных дзяцей і падтрымаць тых, хто жадае атрымаць якасныя веды. Гэта спецыялісты, з якімі мы будзем заўтра працаваць. І іх падрыхтоўка сёння — якасць нашага жыцця заўтра», — адзначыла **Святлана ЛЮБЕЦКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве** падчас семінара-нарады для кіраўнікоў і службовых асоб устаноў адукацыі Цэнтральнага раёна горада Мінска. Мерапрыемства прайшло ў фармаце дыялогавай пляцоўкі.

Святлана Любецкая ацаніла важнасць такіх фарматаў для абмеркавання актуальных пытанняў: «Зараз у Палаце прадстаўнікоў на разглядзе знаходзіцца праект змяненняў у Кодэкс аб адукацыі. І такія пляцоўкі неабходныя, каб з практыкамі абмеркаваць пытанні, у якіх трэба ліквідаваць прабелы, і ўдасканаліць заканадаўства. Сучаснае жыццё патрабуе многіх змяненняў, у тым ліку і ў адукацыі — тут і выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій, дыстанцыйнае навучанне, якое стала важным у перыяд пандэміі. Усё гэта важна аналізаваць з людзьмі, якія працуюць непасрэдна з дзецьмі». Дэпутат заклікала педагогаў уносіць свае прапановы ў праект змяненняў у Кодэкс аб адукацыі, каб новы дакумент атрымаўся максімальна эфектыўны.

Удзельнікі семінара абмяняліся вопытам арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў навучальных установах, пазнаёміліся з эфектыўнымі метадамі і формамі такой работы, абмеркавалі ўзаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі. «Такія мерапрыемствы асабліва важныя напярэдадні Усебеларускага народнага сходу, дзе будуць абмяркоўвацца важныя для грамадства пытанні, у тым ліку і адукацыя. Каб іх вырашаць на такім высокім узроўні, трэба спачатку пагаварыць з непасрэднымі ўдзельнікамі з гэтай сферы, пачуць думку кожнага, зразумець, што іх хвалюе. Толькі так можна вылучыць кірункі, на якіх варта зрабіць акцэнт. Такія дыялогавыя пляцоўкі дазваляюць акумуляваць усё, чым жыве адукацыя і што яе хвалюе, і ўжо з улікам гэтага прымаць рашэнні на ўзроўні ўрада і Прэзідэнта», — адзначыла **Ганна МАЕЎСКАЯ, намеснік кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска.**

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Экспертнае меркаванне

# «Чым бліжэй суседзі адзін да аднаго ў штодзённым жыцці — тым менш супярэчнасцяў па палітычных матывах, тым больш павагі да розных пазіцый»


Фота БелТА.

**Якія чаканні ад Года народнага адзінства ў рэгіёнах Беларусі, чым палітычная густы жыхароў райцэнтраў адрозніваюцца ад сталічных? Якую ролю ў гэтым маюць «новыя медыя» і што за пазіцыю займаюць традыцыйныя СМІ? На гэтыя тэмы сваім меркаваннем са «Звяздой» падзяліўся эксперт, які займаецца тэарэтычнай прапрацоўкай праблематыкі медыя, палітычны аглядальнік, старшыня Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.**

## «ПРАВІНЦЫЯ ВАЛОДАЕ БОЛЬШ ВЫСОКАЙ КУЛЬТУРАЙ ДЫЯЛОГУ»

***— Вы шмат працуеце ў рэгіёнах. Знаёміцеся з меркаваннямі жыхароў розных мясцовасцяў. Якія грамадска значныя пытанні, на ваш погляд, хвалююць найбольш?***

— Адразу адзначу, што ў рэгіёнах цікавасць да дыялогавых пляцовак вышэйшая, чым у сталіцы. Людзі ўскладаюць вялікія надзеі на дэмакратычны фармат агульнанацыянальнага дыялогу і VI Усебеларускі народны сход, які ўспрымаецца як кульмінацыя шматмесячнай работы пляцовак.

Тэма палітыка-інфармацыйнага крызісу падымаецца на ўсіх без выключэння пляцоўках, але гучыць яна інакш, чым у сталіцы. У Мінску журналісты і палітолагі ставяцца да «жнівеньскіх падзей» як да свайго роду «краевугольнага каменя» — зыходнага пункта і падмурка разваг аб наступных палітычных пераўтварэннях. У рэгіёнах жа, у большасці выпадкаў, крызіс успрымаюць як чыста сталічную з'яву, якая мае мала агульнага з рэальнай праблематыкай развіцця.

У рэгіёнах падымаюцца пытанні экалогіі, доступу да чыстай пітной вады, раўнамернага прасторавага развіцця, выдзялення ўчасткаў пад забудову, больш даступнага крэдытавання малога бізнесу і падтрымкі прадпрымальніцтва ў правінцыі. Не сакрэт, што пандэмія ўдарыла па аздараўленчым турызме, аграэкасядзібах.

Удзяляюць жыхары ўвагу рамонту і будаўніцтву дарог мясцовага значэння, укараненню нацыянальнай грантавай сістэмы на культурныя і адукацыйныя праекты, каб хоць трохі канкураваць з імпартнымі фондамі. Менавіта правінцыя дае нам максімальны дэмаграфічны прырост і захоўвае традыцыі шчаслівай сям'і — таму сямейны капітал і сацыяльная інфраструктура тут на значным месцы.

Важная для рэгіёнаў разгрузка мясцовай «вертыкалі» ад нагрувашчвання неўласцівымі ёй функцыямі і перадача апошніх інстытутам грамадзянскай супольнасці. Напрыклад, маладзёжная ініцыятыва — маладзёжным арганізацыям, дадатковая адукацыя — прафільным грамадскім арганізацыям. Тут, дарэчы, Саюз журналістаў яшчэ тры гады таму падхапіў грамадскі запыт і арганізаваў школы-студыі маладых журналістаў ва ўсіх рэгіёнах.

Вельмі шмат асцярог выклікаюць нюансы падатковага заканадаўства. Наўрад ці варта хаваць, што ў небагатых рэгіёнах, асабліва прыгранічных, людзі нярэдка зарабляюць, займаючыся «шэрым», ценявым бізнесам...

Такіх надзённых для рэгіёнаў пытанняў я магу пералічыць яшчэ з некалькі дзясяткаў. Дзеля справядлівасці, большасць з іх ужо закладзены ў праграмы развіцця, пад многія падведзена бюджэтнае і камерцыйнае фінансаванне, частка — у працэсе рэалізацыі. Але калі людзі кажуць пра гэта, значыць, не хапае медыйнага суправаджэння праектаў — пра іх недагаворваюць СМІ і «новыя медыя». Тут мы бачым сваю галоўную задачу і выклік, які ставіць перад намі наша аўдыторыя.

***— Ці актуальная праблема раз'яднання грамадства для рэгіёнаў?***

— У рэгіёнах практычна няма нейкага расколу ў грамадстве ці супрацьстаяння. Па-першае, як ні дзіўна, правінцыя валодае больш высокай культурай дыялогу і палітычнай культурай увогуле. Напрыклад, у буйных гарадах — Асіповічах, Лідзе, Бабруйску, цяжка ўявіць, каб людзі кідаліся ў бойку з-за розніцы ў палітычных поглядах або па заклiку экстрэмісцкіх медыя. Тут хутчэй жывуць сваім розумам, сваёй галавой, а не смартфонам.

У Мінску такое здаралася. Атамізаваная суполка вялікага мегаполіса сцірае элементы базавай, народнай культуры зносін. Чым меншы населены пункт, чым бліжэй суседзі адзін да аднаго ў штодзённым жыцці — тым менш супярэчнасцяў па палітычных матывах, тым больш павагі да розных пазіцый. Такую формулу я для сябе вывеў са зносін з людзьмі.

Па-другое, паўтаруся, жыццё ў рэгіёнах значна больш прывязана да рэальнай і прадукцыйнай працы, таму і запыт нашай «маўклівай большасці» куды больш цвярозы, рэальны, рацыянальны і прывязаны да зямлі.

Нарэшце, ёсць меркаванне, што праблему «расколу» нам падкідваюць выключна звонку. Бо людзі бачаць, якія «вулічныя баі» грымяць у Парыжы, Варшаве, Вашынгтоне і Брусэлі. Людзі бачаць і ведаюць не па чутках пра маштабы карупцыі і бандытызму ва Украіне, аб масавых уцёках моладзі з краін Балтыі.

## ЯК ПРАДЗЯРЖАЎНЫЯ «НОВЫЯ МЕДЫЯ» РАЗГОРТВАЮЦЦА НА МАРШЫ

***— На ваш погляд, якая роля новым медыя аддадзена ў магчымасці аб'яднаць людзей?***

— Пакуль мы, на жаль, назіраем, як «новыя медыя» раз'ядноўваюць. Тут ёсць аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны. Аб'ектыўныя складаюцца ў тым, што за апошнія дзесяць гадоў нашы апаненты спрактыкаваліся ў тэхналогіях масавага маніпулявання грамадскай свядомасцю. У наша інфармацыйнае поле пранікнулі медыя, якія па факце і па стандартах амерыканскага права з'яўляюцца «замежнымі агентамі». Іх мэта — нацкоўваць беларусаў адзін на аднаго, а іх рэсурсы на два парадкі больш, чым тое, што маюць на сёння ўсе прадзяржаўныя медыя разам узятыя. Гэта праблема не толькі і не столькі Беларусі, а тэндэнцыя глабальная.

Яшчэ адна аб'ектыўная прычына — спроба праз «новыя медыя» вырваць Беларусь з агульнага еўразійскага праекта, адарваць ад найбліжэйшых партнёраў па Саюзнай дзяржаве, АДКБ, Еўразійскага эканамічнага саюза. Так, сёння медыя на знешняй інфармацыйнай агрэсіі зрушылася на Маскву і Санкт-Пецярбург. Але не трэба сябе падманваць — гэты ўдар, тэхналогіі, медыйныя правакацыі першапачаткова былі накіраваны на нашу агульную прастору.

Трэцяя рэальнасць — пранікненне ў вобласць масавых камунікацый глабальных сацыяльных сетак. І тут, пагадзіцеся, нават амерыканскае грамадства не было гатова да двайных стандартаў, цэнзуры, варварскіх лічбавых канцлагераў і ўсёмагутных дэфакта антысацыяльных платформаў. Што ўжо казаць пра крэатыўную частку беларускага грамадства. Нам паказалі, як дорага каштуе быць наіўнымі і неразборлівымі ў крыніцах інфармацыі.

Цяпер аб суб'ектыўным. Першае. Беларускія прадзяржаўныя медыя, прасоўваючы аб'яднальны парадак, упусцілі момант, калі трэба было прайсці пакутлівы працэс лічбавізацыі, дапоўніць вёрстку SMM-менеджментам, а газетную аналітыку — стрымавым вяшчаннем у прасторы YouTube. Другое, доўгі час засноўвальнікі нашых СМІ знаходзіліся ва ўпэўненасці, што медыя-суправаджэнне любога праекта, — рэч неабавязковая, на ёй можна сэканоміць або «схалтурыць». Гэты пасыл ішоў і ад улады, і ад бізнесу. Навошта традыцыя па аповеде пра новую дарогу, школу, спартыўны аб'ект або сацыяльную ініцыятыву? Людзі самі ўсё бачаць і разумеюць. Лепш замест гэтага пабудаваць яшчэ адзін аб'ект. Як грамадзянін сваёй краіны скажу — логіка збольшага правільная, сумленная, як сказалі б раней — адкрытая, рабоча-сялянская. Але як журналіст, як удзельнік новай медыя-рэальнасці, я ведаю — гэта так ужо не працуе. У новым медыйным асяроддзі любая з'ява вартая роўна настолькі, наколькі вы пра яе расказалі, раскруцілі, данеслі да грамадства. Асабліва ў кароткай перспектыве. Звярніце ўвагу, якія каласальныя рэсурсы дзяржава ўклала ў барацьбу з першай хваляй пандэміі — дзясяткі і сотні мільёнаў рублёў. А колькі ў прасоўванне гэтай тэмы, у тым ліку праз новыя медыя? Мізэр. Гэтую сферу літаральна здалі без бою нашым медыйным апанентам. У выніку чуткі і плёткі перамаглі рэальнасць і факты. Эмацыянальная напампоўка ўзяла верх над логікай і здаровым сэнсам.

Трэцяе суб'ектыўнае. З-пад нашай прафесіі, свядома ці не, але выбілі навуковую аснову медыясацыялогіі — што чытаюць, чым цікавяцца, што выклікае страх, пра што і каму трэба распавядаць тут і цяпер. Школа медыясацыялогіі ў маштабах усёй краіны захавалася толькі ў Мінску і Магілёве. На мой погляд, гэта больш, чым памылка, гэта шкодніцтва. Усе «новыя платформы» растуць на аснове найдакладнейшай лічбавай медыяметрыі, таргетаванні інфармацыйных патокаў, інфармацыйнай аналітыкі. Яны першапачаткова «ўшыты» ў цела лічбавых платформаў, работа з вялікімі масівамі персанальных даных — сутнасць лічбавай сістэмы прасоўвання кантэнту.

Можна прыводзіць яшчэ шмат фактаў і прыкладаў. І мы павінны разумець — мы не апраўдваемся і не выкрываем. Мы холадна і цвяроза ацэньваем свае шанцы. Так, мы ўпёрліся ў зямлю, але мы контратакуем, вучымся новай тактыцы непасрэдна ў ходзе паядынку...

***— У чым сутнасць гэтай «контратакі»?***

— Гаворка пра класічныя правілы гульні, як у нашых заходніх партнёраў. «Замежныя агенты», фінансаванне экстрэмізму, інфармацыйная агрэсія — усё гэта ўжо ёсць у заканадаўстве і ў судовай практыцы нашых заходніх і ўсходніх партнёраў. Так будзе сумленна. Адзін з важных момантаў — паскораная лічбавізацыя рэгіянальных СМІ і сістэма грантавай падтрымкі блогераў, лідараў меркаванняў. Падкрэслю, нацыянальная сістэма грантаў, каб нашых «інфлюенсераў» не скуплялі дзясяткамі напярэдадні грамадска-палітычнай кампаніі, а патрыятычная плеяда аўтараў выспявала і прабівалася з нашага грамадства.

Мяркуецца і змяненне структуры кіравання рэгіянальных медыя. Так, каб яны больш залежалі ад грамадскіх інтарэсаў, чым ад персаніфікаванага ўплыву заснавальнікаў. Усяк журналісцкая супольнасць стане надзейным кар'ерным ліфтам для таленавітых і амбіцыйных людзей, якія хочуць узяць новыя вяршыні ў прафесіі і зарабіць аўтарытэт у сваёй аўдыторыі.

Мы пашырым жанравую разнастайнасць нашых матэрыялаў. Звярніце ўвагу, як літаральна за пару месяцаў уваскрэслі аўтарская журналістыка, эмацыянальная публіцыстыка, яркая дакументалістыка, разнастайныя фарматы ток-шоу і глыбокія дыялоговыя формы. Гэта не выпадковасць, гэта «другі раўнд», на які мы выйшлі больш сабраныя і падрыхтаваныя.

Дарэчы, вяртаючыся да самага пачатку, менавіта такога пераўтварэння рэгіянальных СМІ чакалі ад нас у рэгіёнах. Інстынкт самазахавання нашай грамадзянскай і палітычнай нацыі падштурхнуў нас да гэтых перамен.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# І смешна, і плакаць хочацца...

*Апошнім часам, пераважна па раніцах, адчуваю сябе сапраўднай вавёркай — той, што круціцца ў коле. Не паспею памыць посуд пасля сняданку, як час гатаваць абед (абавязкова суп!), акрамя таго, іншыя справы вымалёўваюцца. А тут яшчэ прыйшлі лічыльнікі электрычнасці мяняць — напярэдадні ў кватэры свекрыві, дзе мы часта бываем, «знікла» святло, выклікалі «аварыйку». Адным словам, пакуль я займалася хатнімі клопатамі, устанавілі новы лічыльнік, папрасілі азнаёміцца з дакументамі, а пасля іх падпісаць. Я выйшла на калідор перад уваходам у кватэру, дзе мяне чакала жанчына-электрык, прычыніла дзверы (ад іх заўжды цягне холадам) і пачала ўчытвацца ў словы, каля якіх мне патрэбна было паставіць свой подпіс... Як раптам замок з таго боку кватэры неспадзявана шчоўкнуў...*

*Ключоў, канешне, у мяне з сабой не было. Але, у адрозненне ад жанчыны, якая мяняла лічыльнік, я не дужа спалохалася. І гэта нягледзячы на тое, што мабільны тэлефон таксама застаўся дома, а на пліце на ўсю моц суп. На дзеда Сашу, Цёмавага прадзеда (між іншым, ветэрана вайны!), я таксама не вельмі разлічвала: ён добра недачувае, а яшчэ знаходзіцца ў самым далёкім пакоі. Заставалася спадзявацца на кемлівасць свайго не па гадах разумнага сыночка. Справіўшыся з эмоцыямі, спакойна папрасіла Арцёма пакруціць замок у іншы бок. Ён мяне паслухаўся — і дзверы адчыніліся.*

*У той жа дзень зусім у іншым горадзе ў машыне зачынілася Цёмава стрыечная сястра. Пакуль яе мама дапамагала сыну-школьніку выйсці з аўтамабіля, амаль двухгадовая Ева націснула на кнопачкі, якія заблакавалі аўто. Як ні прасіла маці падняць іх, малая не слухалася, а, можа, проста не разумела, што ад яе хочуць. Тэлефон па-здрадніцку свяціўся ў салоне, ключы засталіся там, дзе яны павінны знаходзіцца падчас руху аўтамабіля, нумар мужа, як на ліха, выскачыў з галавы. Дзякуй богу, што ён быў запісаны ў маці сынавай аднакласніцы, дзякуючы якой удалося паведаміць пра надзвычайнае здарэнне галаве сям'і, ад якога, вядома, усе атрымалі па шапцы.*

*Наш Цёмік летам таксама заблакаваў дзверы аўтамабіля. Пакуль мы на лецішчы збіралі вішні, малы забаўляўся ў машыне — бацька дазволіў сыну на некаторы час адчуць сябе кіроўцам. Калі гэта надакучыла, Арцём прыйшоў да нас падсілкавацца сакавітымі ягадамі. Я ж, не паглядзеўшы, што ў салоне ўсе кнопкі ў рэжыме закрыцця (каб не садзіўся акамулятар), зачыніла машыну, у якую мы ўжо потым трапіць не маглі — пакласці сабе ў кішэню ключы ніхто не здагадаўся.*

*Падобнай гісторыяй гэтымі днямі падзялілася і свякроў. Калі яе старэйшы сын (тады не большы за Цёміка) спаў, яна вырашыла прыбраць на лесвічнай пляцоўцы. Пакуль мыла падлогу, з нейкім пытаннем да яе прыйшоў муж, перад гэтым проста аўтаматычна шчоўкнуўшы дзвярным замком. Ключы, «класічна», засталіся ў кватэры. Тым часам у ёй напаўнялася ванна. Выручыла пажарная лесвіца на лоджыі, якая, відаць, невыпадкова была запланаваная маскоўскімі архітэктарамі, па чыіх праектах будаваўся дом. Менавіта дзякуючы гэтай непатрэбнай, як усе дагэтуль лічылі, лесвіцы і, безумоўна, суседзям, якія не праігнаравалі просьбу прайсці на іх лоджыю, мой будучы свёкар трапіў у сваю кватэру.*

*У сучасных апартаментах пажарныя лесвіцы на лоджыях і балконах не прадугледжаны. Хоць падобных выпадкаў, якія могуць прывесці да трагедыі, на жаль, менш не становіцца. І што б рабілі бацькі ў падобнай сітуацыі? Я бачу толькі два варыянты: альбо ўзламліваць замок, альбо выклікаць службу МНС. І замест таго каб ліквідаваць пажар альбо адпачываць пасля складанай выратавальнай аперацыі, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, няхай нават і за грошы, будуць «браць штурмам» нашу кватэру. А ўсё з-за нашага бяспамяцтва, з-за няўважлівасці, часам нават абыякавасці.*

*На шчасце, больш-менш прадбачлівыя бацькі пачалі на вокны вешаць замкі альбо адразу замаўляюць шклопакеты з блакіроўкай на ручках. У кватэрах, дзе выхоўваюць малых дзяцей, усё часцей у разетках заўважаеш заглушкі, іншыя ноу-хау для бяспечнага існавання тых, хто яшчэ зусім нядаўна з'явіўся на свет. Аднак не кожныя бацькі могуць загадзя ўсё прадугледзець, некаторыя проста недаацэньваюць спрыт сваіх дзяцей. Як я аднойчы, калі мой гадавалы Цёмік, які яшчэ самастойна не ўмеў хадзіць, здолеў дацягнуцца да шафкі і вывернуць на сябе кубак з гарачай гарбатай.*

*І гэтыя сітуацыі з гісторыі толькі адной, маёй, сям'і. На шчасце, калі ўзгадваем іх, на нашым твары, як правіла, з'яўляецца ўсмешка. Аднак колькі падобных гісторый мелі абсалютна іншы фінал...*

**Вераніка КАНЮТА.**

Сямейная газета

Выпуск № 2 (161)

Тыя, хто побач

## Віктар БАБАРЫКІН: «Прапанову зрабіў у дзень закаханых»



Вольга, Віктар і Аляксей БАБАРЫКІНЫ.

**Віктар Бабарыкін 17 гадоў кіраваў Прэзідэнцкім аркестрам Беларусі, які публіка ведае па цудоўных канцэртных праграмах. Статусная пасада, удзел у пратакольных мерапрыемствах не перашкаджалі Віктару, калі змаўкалі фанфары, захоўваць у сваіх паводзінах нешта хлапечае, як ён сам пра сябе кажа, «дырыжор-хуліган». Мы даўно знаёмыя, і ў маэстра мне імпанавала тое, што ён мог папрасіць напісаць «пра вельмі здольнага маладога музыканта», але ніколі — пра сябе. Часам мы бачыліся на чужых канцэртах, на якія ён ходзіць разам з жонкай Вольгай. І трымаюцца яны заўсёды так, быццам і не сям'я з 12-гадовым стажам, а закаханая пара.**

***— Як вы пазнаёміліся?***

**Віктар Бабарыкін:** — Не паверыце! У Нацыянальнай бібліятэцы. Оля ў той час была студэнткай гістфака БДУ і рыхтавалася да курсавой. А я ўжо шэсць гадоў кіраваў Прэзідэнцкім аркестрам і прыйшоў па нотны матэрыял. Убачыў прыгожую дзяўчыну і, вядома ж, запатрабаваў у яе нумар тэлефона.

**Вольга Бабарыкіна:** — Даволі доўга я не ведала, што Віктар музыкант, і больш за тое, галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра. Пытацца адразу ў лоб: «Кім працуеш?», мне было неяк няёмка. Некалькі разоў ён запрашаў мяне на канцэрты ў філармонію. Я заўважыла, што многія людзі з ім вельмі паважліва вітаюцца. Нарэшце, спытала: маўляў, усе цябе тут ведаюць, а дзе ты працуеш?

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Круглы стол

# ЗРОБЛЕНА МНОГА. АЛЕ ГЭТАГА МАЛА

### Як зрабіць так, каб беларусаў нараджалася больш?

**Развіццё сістэмы дзяржаўнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі і асноўныя праблемныя пытанні сацыяльнай падтрымкі шматдзетных, пытанні аховы здароўя, аховы мацярынства і дзяцінства разгледзелі на круглым стале «Дзяржаўная падтрымка сям'і з дзецьмі — адзін з ключавых кірункаў сацыяльнай палітыкі» ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У абмеркаванні ўдзельнічалі парламентарыі, члены Савета Рэспублікі, прадстаўнікі Міністэрства адукацыі і іншыя.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*



# Даступнае і якаснае

## Такое павінна быць жыллё

**Штогадовы аб'ём уводу жылля ў Беларусі плануецца павялічыць з 4 млн кв. м у 2021 годзе да 4,5 млн кв.м у 2025-м. Гэта прадугледжана адпаведнай дзяржаўнай праграмай на 2021—2025 гады.**

Праграма «Будаўніцтва жылля» накіравана на павышэнне ўзроўню забяспечанасці насельніцтва даступным і камфортным асяроддзем пражывання, стварэнне бяспечных і экалагічна ўстойлівых умоў.

Згодна з дакументам, з 2021 да канца 2025 года плануецца паэтапна павялічыць аб'ёмы будаўніцтва агульнай плошчы жылля, жылля з дзяржпадтрымкай, арэнднага жылля (у тым ліку для ваеннаслужачых) і электрадамоў. Рост аб'ёмаў будаўніцтва жылля прадугледжваецца як у цэлым па краіне, так і па рэгіёнах. За пяць гадоў таксама плануецца ўвесці ў эксплуатацыю каля 725 тыс. кв. м арэнднага жылля і амаль 2 млн кв. м плошчы электрадамоў. Згодна з праграмай, будаўніцтва індывідуальнага жылля сфарміруе найбольш разнастайны па структуры спажывецкі попыт, які спалучае розныя камбінацыі кошту, эксплуатацыйных і праектных рашэнняў, прымяненне экалагічных матэрыялаў. Прадоўжыцца развіццё комплекснага жыллёвага будаўніцтва. Пры ўзвядзенні шматпавярховых дамоў будзе акцэнтавана ўвага на выкарыстанні энергазберагальных рашэнняў, тэхналогій «разумнага дома».

Для грамадзян, якія маюць права на дзяржпадтрымку, будаўніцтва жылля будзе ажыццяўляцца ў жылых дамах тыпавых спажывецкіх якасцяў па эканамічных энергаэфектыўных праектах. Адным з важных напрамкаў застанецца забеспячэнне жыллём шматдзетных сем'яў, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама дзяцей-сірот, інвалідаў і іншых сацыяльна слаба абароненых катэгорый грамадзян.

Сярэдні кошт 1 кв. м жылля, пабудаванага з дзяржпадтрымкай, у 2021 годзе вызначаны ў памеры Br1152, плануецца, што да 2025-га ён вырасце да Br1433,2. Усе шматкватэрныя дамы павінны быць забяспечаны інжынернай і транспартнай інфраструктурай, долю ўчасткаў для індывідуальнага будаўніцтва з мінімальнай інфраструктурай будуць павялічваць з 82 працэнтаў у 2021 годзе да 90 працэнтаў да канца пяцігодкі.

Адказным заказчыкам дзяржпраграмы вызначана Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. Акрамя Мінбудархітэктуры, заказчыкамі выступаюць Мінэнерга, Мінсувязі, аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам.

# ЗРОБЛЕНА МНОГА. АЛЕ ГЭТАГА МАЛА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «СГ»).*

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянціна КУРСЕВІЧ:**


sb.by

— Дзяржаўная падтрымка сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, — адзін з ключавых кірункаў сацыяльнай палітыкі ў Беларусі. Сямейная палітыка ўключае ў сябе шырокамаштабную колькасць мер ад нараджэння і выхавання дзіцяці да дзяржаўнай падтрымкі сем'яў пры будаўніцтве і рэканструкцыі жылля, а таксама льготы і гарантыі ў сферах адукацыі, аховы здароўя, камунальнай сферы, пенсійнага і падатковага заканадаўства. Сёння сем'і, якія выхоўваюць дзяцей, атрымліваюць у нас 11 відаў дапамог. Гэтай дапамогай ахоплена больш за 460 тысяч малых. Такім чынам, кожнае чацвёртае дзіця знаходзіцца пад апекай дзяржавы. Акцэнт робіцца на шматдзетныя сем'і. З 2015 года дзейнічае праграма сямейнага капіталу, якая даказала сваю эфектыўнасць, таму што за апошні час колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася на 40 працэнтаў, а гэта 112 тысяч сем'яў, якія выхоўваюць трэцяга, чацвёртага і наступных дзяцей. Праграма сямейнага капіталу працягнута да 2024 года ўключна. Яе навацыі ў тым, што яна вылічваецца ў беларускіх рублях, і ёсць магчымасць наступнай індэксацыі. Акрамя таго, пашыраны асноўныя кірункі датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу па патрэбах шматдзетнай сям'і. Самае асноўнае пытанне, якое хвалюе маладыя і шматдзетныя сем'і, — жыллёвае. Так, сярод заяў на датэрміновае выкарыстанне сямейнага капіталу, якія паступілі ад шматдзетных сем'яў, 90 працэнтаў — просьбы аказаць садзейнічанне пры будаўніцтве жылля. Сур'ёзная работа праводзіцца парламентарыямі ў плане ўдасканалення заканадаўства. Гэта пенсійнае забеспячэнне, працоўныя адносіны, ахова працы, сацыяльнае абслугоўванне. Так, у 2017 годзе ўступіў у сілу закон аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія былі накіраваны на падтрымку найбольш уразлівых слаёў насельніцтва. Над гэтым законапраектам працавала камісія па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы. Калі гаварыць пра пенсійнае забеспячэнне, то з 1 студзеня 2021 года ўжо ўступілі ў сілу папраўкі, што датычацца зніжэння страхавога стажу для жанчын, якія нарадзілі чацвярых дзяцей, — гэта будзе 10 гадоў, а для жанчын, якія нарадзілі пяць і больш дзяцей, страхавы стаж для налічэння пенсіі будзе раўняцца 5 гадам. Акрамя таго, павялічыцца з 9 да 12 гадоў тэрмін, які ўвойдзе ў агульны стаж для налічэння пенсіі. У далейшым найбліжэйшыя пяць гадоў дзяржаўная падтрымка сем'яў будзе рэалізоўвацца ў рамках праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», зацверджанай літаральна на днях. У праграме аддадзена ўвага комплекснаму ўдасканаленню мер падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей.

**«Сёння многія маладыя людзі занепакоеныя рызыкай недаатрымліваць даходы, калі ў іх народзіцца дзіця. Таму трэба больш увагі звярнуць на маладыя сем'і, дапамагчы ім рашыцца на дзіця».**

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ:**

— Я хацела б канкрэтызаваць лічбы: больш за Br5 млрд выдзелена ў 2021 годзе на восем асноўных напрамкаў падтрымкі, самая істотная частка (Br2,7 млрд) — на дзяржаўныя дапамогі сем'ям. Вы ведаеце, што шматдзетныя сем'і — гэта прыярытэт для нашай краіны. Неабходна, каб шматдзетная сям'я стала нормай у Беларусі. У 1992—1994 гадах колькасць насельніцтва ў краіне была больш за 10 млн чалавек. З 1992 года назіраецца скарачэнне нараджальнасці. Толькі ў



2015—2016-м мы выйшлі на ўзровень больш за 100 тысяч народжаных, а сёння зноў назіраем спад.

Сумарны каэфіцыент нараджальнасці (СКН) — гэта колькасць дзяцей, што прыходзіцца на адну жанчыну. У 1958 годзе было тры дзіцяці. У 1990-м — 1,91, і ўжо да 2000—2005-га мы выйшлі на ўзровень 1,25. Міжнародныя эксперты кажуць, што калі апусціцца на ўзровень ніжэй за 1,3, то аднавіць узнаўленне насельніцтва будзе нерэальна. Таму краіне трэба хоць бы стабілізаваць нараджальнасць... Змяняецца свет, змяняюцца пакаленні і іх каштоўнасці. І трэба распрацоўваць дзяржпраграмы, лічачыся з гэтымі зменамі. Сур'ёзная праблема — «познія» шлюбы. Калі раней жанчына ў 20 гадоў нараджала, у яе заставалася яшчэ 20 гадоў на нараджэнне іншых дзяцей. А сёння ў нашага дзетароднага насельніцтва ёсць толькі 10 гадоў, каб паспець нарадзіць, а за 10 гадоў нарадзіць траіх — задача складаная.

Даволі сур'ёзная мера па падтрымцы шматдзетных — будаўніцтва жылля, але мы яе актуальнасць страцілі, калі не выканалі абяцанне будаўніцтва жылля па працягу года пасля пастаноўкі на ўлік. Не выконваючы па працягу шэрагу гадоў гэтыя абавязацельствы, мы страцілі давер шматдзетных сем'яў. Але ёсць добрыя навіны — у апошнія тры гады мы актыўна ўвайшлі ў фазу будаўніцтва і таму чакаем станоўчых водгукаў ад сем'яў. Сёння мы звярнулі ўвагу, што 24 працэнты шматдзетных сем'яў звяртаюцца па індывідуальную адрасную дапамогу, і для таго, каб дапамагчы ўцягнуць яшчэ больш сем'яў у гэты ўнікальны дзяржаўны механізм дапамогі, мы з 1 верасня 2020 года павялічылі перыяд аказання адраснай дапамогі. Цяпер замест шасці месяцаў такую дапамогу можна будзе атрымліваць на працягу года. Таксама мы павялічылі крытэрыі наяўнасці патрэбы. І за чатыры месяцы мінулага года ўбачылі вялікі водгук на гэтую меру ад шматдзетных сем'яў. Аказалася, гэта адчувальная падтрымка для іх.

**Першы намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН:**

— Хацелася б сказаць пра здароўе нацыі. Калі ў нас не будзе здаровых маці, то ў нас не будзе здаровых дзяцей. Чым пазней жанчына прыходзіць нараджаць першае дзіця, тым больш у нас праблем з гэтай жанчынай, мы з хваляваннем і вялікай увагай ставімся да такой жанчыны і яе народжанага дзіцяці. Мы знаходзімся сёння на нізкім узроўні мацярынскай і дзіцячай смяротнасці, і гэта наша дасягненне. Але ва ўмовах падзення нараджальнасці і прыняцця жанчынамі рашэннем нарадзіць першае дзіця пазней, узнікаюць праблемы з зачаццем дзіцяці, я ўжо не кажу, як складана потым такое дзіця вынасіць і нарадзіць. Таму з першага студзеня мы пачалі работу па стварэнні сістэмы для магчымасці зрабіць першую спробу ЭКА бясплатна. Спадзяёмся, што дзякуючы такой меры сёлета народзіцца яшчэ дзве тысячы маленькіх беларусаў... Хацелася б пагаварыць і пра такую бяду грамадства, як аборты. Права жанчыны вызначаць, захоўваць жыццё дзіцяці або не, ніхто адбіраць не будзе. Тысячы жанчын за апошнія некалькі гадоў прынялі рашэнне перапыніць цяжарнасць, і ў сённяшніх умовах падзенне нараджальнасці — гэта проста недапушчальна. Хацелася б, каб рашэнне, нараджаць ці не, маці і бацька прымалі разам. Тады, я думаю, з 23 працэнтаў эфектыўнасці перадабортнага кансультавання мы прыйдзем да 50 працэнтаў. Я ўпэўнена, што калі тату расказаць і паказаць, што такое аборт, ён знойдзе патрэбныя словы для жанчыны і магчымасць для сям'і выхаваць дзіця. Неабходна выбудоўваць нацыянальную сістэму планавання сям'і. Пакаленне 90-х, якое прыводзіць сваіх дзяцей сёння ў школу, нематываванае на традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. І мы павінны сумесна з сістэмай адукацыі распрацаваць падыходы да распаўсюджвання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў сярод моладзі.



**Ірына КАСЦЕВІЧ:**

— Яшчэ хацелася б пагаварыць аб праблеме разводаў. У краіне зніжаецца ўзровень шлюбнасці і павялічваецца колькасць разводаў. Пры 62 тысячах заключаных шлюбаў у год у нас 34 тысячы разводаў. Наша задача прыдумаць, як знізіць такую іх вялізную колькасць. Каб вырашыць гэтую праблему, трэба вырашыць, як умацаваць інстытут сям'і і захаваць традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. Прызнаём, што сярод шматдзетных ёсць праблемныя сем'і, але іх на самай справе зусім няшмат. Асноўная маса — гэта шчаслівыя і добрыя сем'і. І я ў гэтым асабіста пераканалася, працуючы ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Пра гэта мала кажуць, і мы павінны паказаць гэта так, каб усім дваццацігадовым захацелася мець вялікую і моцную сям'ю. Важна яшчэ выканаць баланс для жанчыны: сям'я — работа. Мы стараліся летась і далі нашым татам двухтыднёвы адпачынак, каб мужчыны маглі пераканацца, наколькі жанчыне важная падтрымка. Неабходна зняць з жанчыны двайную нагрузку. Таму задача на будучую пяцігодку — прыцягнуць мужчын да актыўнага выхавання дзяцей. Гэта важны кірунак для развіцця адказнага бацькоўства ў нашай краіне. Трэба сёння ісці ў школу і тлумачыць дзецям, што такое сям'я і наколькі гэта важна. Казаць пра тое, што працягласць жыцця мужчыны ў сям'і вышэйшая, чым у мужчыны без сям'і і гэта таксама трэба прызнаваць.

**Старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці Таццяна ЛУГІНА:**


Фота БелТА.

— Я як работадаўца лічу, што для шматдзетных зроблена больш чым дастаткова. У мяне самой двое дзяцей, мой сын нядаўна ажаніўся. Яны з жонкай шмат працавалі і вырашылі самі пабудаваць жыллё. Узялі крэдыт. Калі ж зайшла гаворка пра дзяцей, ён адмовіўся ад гэтай ідэі на пэўны час. Бо, калі яго жонка пойдзе ў дэкрэт, сям'я не зможа забяспечыць аплату ўзятых абавязацельстваў перад банкам і выхоўваць дзіця. Я хачу сказаць, што сёння многія маладыя людзі занепакоеныя рызыкай недаатрымліваць даходы, калі ў іх народзіцца дзіця. Таму трэба больш увагі звярнуць на маладыя сем'і, дапамагчы ім рашыцца на дзіця. Прыдумаць, якія меры можа прынець дзяржава ў гэтым кірунку.

**Матэрыялы падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# «Прапанову зрабіў у дзень закаханых»



У руках у Віктара той самы букет.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**Віктар:** — А я так бясклапотна адказаў: у Палацы Рэспублікі, займаюся сцэнічным асвятленнем. Я ўжо не быў наіўным хлопцам і ведаў, што многія дзяўчаты шукаюць выключна статусных жаніхоў. А хочацца ж, каб любілі мяне, а не маё становішча ў соцыуме.

***— І як адбылося выкрыццё?***

**Віктар:** — Оля ўбачыла нейкі канцэрт па тэлевізары. Тэлефануе мне: «Гэта быў ты? Па тэлевізары?» Кажу: «Так, я. А што?» Мяркуючы па тым, як развіваліся падзеі, Оля зла на мяне не трымала.

***— А як яны развіваліся?***

**Віктар:** — Сустракаліся мы прыкладна год, а 14 лютага вырашыў зрабіць прапанову Вользе. Запрасіў у кафэ, замовіў шампанскае, піроженыя, купіў кветкі. Міла размаўляем, а потым я дастаю скрыначку з пярсцёнкам. Дзяўчына пачырванела, але так вытанчана адказала: «Я падумаю». Не падганяў, але і думала яна хутка. Калі сказала «так», я са сваёй мамай паехаў знаёміцца з Олінымі бацькамі. Яна іх, вядома, падрыхтавала да нашага візіту. Вельмі добрыя, прыемныя, інтэлігентныя людзі, у той час абодва працавалі ў школе. Цешча і цяпер выкладае рускую мову, а цесць быў настаўнікам фізкультуры, але некалькі гадоў як памяняў работу.

***— Аб вашым вяселлі шмат пісалі ў прэсе нават памятаю загаловак, накшталт «Віктар Бабарыкін ажаніўся на працоўным месцы».***

**Віктар:** — Так, вяселле спраўлялі ў рэстаране Палаца Рэспублікі, дзе знаходзіцца рэпетыцыйная база аркестра. Як свайму работніку, зрабілі добрую зніжку. Дзень вяселля абрала Оля разам з нашымі мамамі — гэта было 8 жніўня 2008 года. Я сапраўды асабістае жыццё не імкнуся афішаваць. Таму было шмат сюрпрызаў. Потым ужо я даведаўся, хто іх рыхтаваў. Мы распісаліся ў Палацы шлюбаў. Я пад'ехаў на лімузіне, Оля — у джыпе, за рулём якога была дзяўчына. Мы выходзім і трапляем пад абстрэл фота- і тэлекамер. Адкуль? Аказваецца, мой сябар Слава Крымер паведаміў пра вяселле «па сакрэце» журналістам. Пасля роспісу нас чакаў яшчэ адзін сюрпрыз — прывезлі букет ад Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

Гасцей на вяселлі ў нас было шмат, сабралі разам сяброў і сваякоў. У Олі вялікая і вельмі моцная радня, мае сваякі таксама адгукнуліся — нават з Украіны прыехалі. Весці вяселле запрасіў свайго сябра Сяргея Краўца. Ён рыхтаваў і культурную праграму, але былі і нечаканыя падарункі. Прыехаў Тарыэл Майсурадзэ з грузінскім квартэтам, выканалі некалькі прыгожых песень. Ашаламляльнае грузінскае шматгалоссе! Салістка беларускай оперы Алена Шведава з мужам таксама павіншавала нас. Лёша Хлястоў, можна сказаць, забег — павіншаваў, праспяваў і далей панёсся.

Употайкі ад мяне рэжысёр Надзея Гаркунова напісала сцэнарый выкрадання нявесты, але я і мае сябры сарвалі гэтыя планы. Вяселле не проста было ў дзень трох васьмёрак — яно супала з адкрыццём Алімпіяды ў Пекіне, дык яшчэ і гэтую тэму абгралі. Увогуле, прайшло ўжо колькі гадоў, а ўспаміны па-ранейшаму пра гэты дзень цёплыя. Я яшчэ запрасіў двух фатографаў за ганарар. А мэтр беларускай фотажурналістыкі Юрый Іваноў, вялікі сябар аркестра, зрабіў фотасесію па дружбе. І падарыў нам велізарны калаж з вясельных фота — тры на тры метры.

***— Такое вяселле — гэта ваша агульнае жаданне? Бо як часам бывае, маладыя кажуць, што ім гэта не трэба, а бацькі настойліва патрабуюць...***

**Вольга:** — У нас наадварот не абмяркоўваўся варыянт — пайсці і ціхенька распісацца. Усе выступалі за вялікую сямейную ўрачыстасць. Сваякоў-родных цётак, якіх ні разу ў жыцці не бачылі, у нас дакладна не было. Мы запрасілі блізкіх людзей і проста дзяліліся з імі сваёй радасцю.

**Віктар:** — Не хачу нікога крытыкаваць, кожны сам вырашае. Але я рады, што ў нас было менавіта такое вяселле. Мы самі да яго актыўна рыхтаваліся. Заходзячы ў «Каравай», успамінаю, як заказваў там вясельны торт, а потым забіраў яго разам з цесцем. Ехаў у машыне, усю дарогу трымаючы яго амаль што на выцягнутых руках. І гэта не асацыюецца з нейкім дыскамфортам, наадварот, з прадчуваннем чагосьці радаснага.



***— Сын у вас ужо вялікі. Вы абмяркоўвалі, калі заводзіць дзіця, або як атрымалася, так атрымалася?***

**Вольга:** — Замуж я выходзіла на пятым курсе, таму планавалі так, каб скончыць універсітэт, уладкавацца на работу, а тады можна ... Мы хацелі дзіця, і лічу, што сын у нас з'явіўся своечасова. Мне пашанцавала, цяжарнасць і роды вялі добрыя ўрачы ў 1-м радзільным доме. Вельмі ўдзячная маёй маме і свекрыві — яны заўсёды дапамагалі, падстрахоўвалі.

**Віктар:** — Так атрымалася, што ў самы складаны перыяд, калі ў Лёшы рэзаліся зубкі, я быў у працяглай камандзіроўцы. Калі Лёша быў зусім малюсенькі, купаць яго дапамагалі бабулі. У жанчын свае рытуалы, а я ўключаў музыку. Асабліва запомнілася, калі ўключыў запіс оперы «Князь Ігар», а аркестрам дырыжыраваў Валерый Гергіеў. Жанчыны накінуліся на мяне: што ты ўсё са сваёй музыкай... А я ведаю, што дзецям карысна слухаць прыгожую музыку ў добрым выкананні.

***— І колькі ў вас зараз музыкаў у сям'і?***

**Віктар:** — Двое: я і Лёша. Часам гэта ўжо і шмат *(смяецца)*. А вось жонку спецыяльна шукаў не ў музычным асяроддзі. Дома ўсё ж такі хочацца цішыні. І потым, я прытрымліваюся кансерватыўных поглядаў: у сям'і павінна быць адно прозвішча. А была б Оля, напрыклад, спявачкай, і пачалося б: я — зорка і на прозвішча мужа не перайду.

***— Але сына «на музыку» аддалі?***

**Віктар:** — Ён у тры гады ўпершыню падышоў да піяніна і вельмі зацікавіўся. У першы клас Лёша пайшоў у звычайную агульнаадукацыйную гімназію. Тады ж хадзіў на хакей, год займаўся ў ХК «Юнацтва». Але, па-першае, гэта вельмі затратны від спорту — хакейная экіпіроўка, мякка скажам, нятаннае задавальненне. Па-другое, дзіця трэба адвезці-прывезці з гэтай цяжкай формай. Магчыма, з усім гэтым мы б і мірыліся, але калі Лёша атрымаў траўму, я катэгарычна сказаў «не» хакею. Ніхто не пярэчыў, сын перайшоў вучыцца ў гімназію-каледж пры Акадэміі музыкі, і яму там вельмі падабаецца. Праўда, спярша ён хадзіў на падрыхтоўчае аддзяленне. Вось там было весела — усе дзеці на занятках з бацькамі, інакш малыя сядзяць у смартфонах. Мы дарэчы, сур'ёзна абмяжоўваем карыстанне гаджэтамі. Сам не люблю у музычнай школе сальфеджыа і вельмі разумею сына. Але яму пашанцавала — у іх выдатны выкладчык, які гэты сумны прадмет праводзіла ў гульнявой форме. Цяпер Лёша займаецца па класе харавога дырыжыравання і ўзмоцнена фартэпіяна. У будучыні яму гэта вельмі дапаможа ў рабоце...

***— Гэта значыць, вы ўжо ўсё вырашылі: сын будзе дырыжорам!***

**Віктар:** — Не, нічога я не вырашыў. Прафесію ён абярэ сам. Я яму і зараз кажу, што нават калі ты не станеш прафесійным музыкантам, гэты багаж не будзе лішні ў жыцці. Сыграеш на піяніна прыгожую мелодыю для дзяўчыны — і ў цябе больш шанцаў, чым у іншых хлопцаў. Але паколькі я разумею, на што важна звяртаць увагу, то падказваю. Натуральна, я бачыў дзяцей, якія займаюцца з-пад палкі. Наўрад ці з іх атрымаюцца класныя музыканты. Лёшу падабаецца, з хорам ліцэя ён шмат канцэртуе. У нас цяпер тры піяніна — дома, на дачы і ў бабулі. Вядома, як нармальнае дзіця, ён трошкі лянуецца, і трэцяму інструменту — у бабулі ў Маладзечне — не моцна ўзрадаваўся.

**Вольга:** — Лёша — такі цэнтр прыцягнення ў нашай радні. Англійскай мовай з ім дадаткова займаецца мая сястра, бабулі і я кантралюем агульнаадукацыйныя прадметы, тата — галоўны па музыцы.

**Віктар:** — І пакуль мы перамагаем: па музыцы ў Лёшы толькі «дзясяткі»!

***— А хатнія абавязкі ў вас неяк падзелены ў сям'і?***

**Віктар:** — Мабыць, не вельмі. Часцей за ўсё нешта патрэбнае робіць той, у каго ёсць час. У нас ёсць пасудамыечная машына, Оля і нашы мамы на яе не нарадуюцца, я люблю мыць посуд па-старому — рукамі. Жонка сочыць, каб мы з сынам хадзілі ў напрасаваных кашулях, я гляджу за абуткам усёй сям'і па прынцыпе: новыя набойкі лепш паставіць на тыдзень раней, чым на два дні пазней. Уборку ў кватэры робім усе ўтраіх.

Цяпер вяду аўтарскую праграму на радыё Мінск «Вечар у мажоры», у якую запрашаю цікавых суразмоўцаў са свету музыкі. Пасля запісу іду дадому пешшу, калі трэба, заходжу ў краму па прадукты. Оля выдатна гатуе, але і я часам магу пакулінарыць.

Мой фірменны абавязак — гуляць з сабакам. Першае, што я зрабіў пасля звальнення з аркестра, — купіў сабаку. Даўно марыў пра гэта, але разумеў, што часу ў мяне на гадаванца няма. Вядома, калі вернемся да нармальнага жыцця, без ковіду, пачнуцца гастролі, таму ўжо дамовіліся, што Лёша мяне падменіць.

***— Хто ў вас галоўны бухгалтар у сям'і?***

**Віктар:** — Ведаеце анекдот? Жонка кажа мужу: «Мой заробак — гэта мой, а твой — гэта наш агульны». Таму галоўны бухгалтар — я. Праўда, у першую хвалю каранавіруса так атрымалася, што ўсе мае кантракты як запрашанага дырыжора былі прыпыненыя, і «нашымі» былі грошы Вольгі.

***— З якога ўзросту даяце сыну грошы на кішэнныя расходы?***

**Віктар:** — Пакуль мы не прыйшлі да такой сістэмы, каб выдаваць дзіцяці штотыдзень пэўную суму. Цяпер ён атрымлівае «мэтавыя ўзносы». Неяк я заўважыў у яго заплечніку абгорткі ад шакаладных батончыкаў. Усё разумею, сам быў такі... Але з сынам дамовіўся, што ён прыносіць чэк са сталовай. У Лёшы навучальны дзень, як у дарослага: а 8-й раніцы з'яджае ў гімназію, у пяць вечара вяртаецца. Таму важна, каб ён нармальна харчаваўся, а не любімымі салодкімі прысмакамі.

***— Вы строгія бацькі?***

**Віктар:** — Напэўна, розныя, у залежнасці ад сітуацыі. Наогул, я з сынам сябрую, у нас агульны інтарэс — музыка, мы разам ходзім у басейн, глядзім спартыўныя перадачы.

**Вольга:** — Бацькам трэба старацца быць цікавымі для дзіцяці як асобы, тады з'яўляецца шчырая павага. Бываюць сітуацыі, калі трэба праявіць строгасць, але рабіць гэта вельмі далікатна, так, каб дзіця не замкнулася, каб не страціць яго давер. У дзяцей жа таксама бываюць складаныя моманты, таму вельмі важна так пабудаваць адносіны, каб сын мог прыйсці да нас і падзяліцца сваім праблемамі або сумненнямі.

***— Як вы любіце адпачываць?***

**Віктар:** — У даковідны час ездзілі на мора. Выбіралі тур «усё ўключана», каб бясклапотна бавіць час. Калі шчыра, я не самы вялікі прыхільнік пляжнага адпачынку, але калі сям'і падабаецца... Раней заўважаў за сабой, а мінулым летам дакладна зразумеў, што люблю адпачываць на лецішчы — там ты ўвесь час у руху, то газон косіш, то нешта майструеш. Перад закрыццём сезона трэба было ўстанавіць ралеты на вокны. Думаў, што гэта вышэйшая матэматыка для музыканта, але справіўся. У некаторай ступені і жыццё прымусіла: даходы знізіліся, таму даводзілася асвойваць тое, што раней рабілі нанятыя людзі. Але ў выніку ўсе гэтыя клопаты мне вельмі спадабаліся.

**Вольга:** — Канешне, мы асцерагаемся ковіду, выконваем усе меры засцярогі. Але нават у такой сітуацыі можна знайсці станоўчыя моманты. Даволі доўга я працую дыстанцыйна, і ў Віктара аказалася больш вольнага часу. Для нас гэта залаты перыяд, таму што мы значна больш бываем разам, чым раней.

***— А хто ў вас у сям'і галоўны дырыжор?***

**Віктар і Вольга разам:** — Я!

***— Па чарзе дырыжыруеце? Як удаецца дамаўляцца?***

**Віктар:** — Дзіўна, але ў нас атрымліваецца, хоць я па характары вельмі выбухны — такі ўраган, а Оля — вельмі спакойная і разважлівая... дзяўчына з характарам.

**Вольга:** — Напэўна, таму нам і цікава разам.

***— Віктар, 13 лютага адбудзецца ваш дэбют як дырыжора Белдзяржфілармоніі. Вы запрашаеце публіку на сваю аўтарскую праграму, прысвечаную Дню закаханых, «Мужчына & Жанчына». Чаму менавіта з гэтым канцэртам вяртаецеся на беларускую сцэну?***

**Віктар:** — Сваю ролю адыграла дата. Я шчыра перакананы, што такіх канцэртаў, на якіх камфортна менавіта парам, у нас няшмат. Сябе ўспамінаю: куды пайсці з дзяўчынай — выбар невялікі. Таму хачу падарыць публіцы прыгожую музыку і прадчуванне таго, што вясна не за гарамі.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота з архіва сям'і Бабарыкіных і Юрыя Іванова.**

# Па-за зонай камфорту

**Новую кнігу Сафія ВОРСА пісала ў цягніках, у гарах і ноччу на кухнях у розных краінах свету.**




У выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выйшла кніга маладой беларускай пісьменніцы Сафіі Ворсы «Рыба». Сюды трапілі пяць апавяданняў — «Рыба», «Чалавек за аблокамі», «Бегункі», «Update» і «Пошукі разумення». Вельмі розныя, але аднолькава ўражальныя, яны прымушаюць чытача многае пераасэнсаваць і выйсці з зоны камфорту.

«Часам для шчасця патрэбна зусім няшмат. Аўтар кнігі «Рыба» Сафія Ворса змяшчае чытача ў сваю, не падобную да іншых, сістэму каардынат і ў даступнай форме паказвае, як можна знайсці радасць там, дзе не чакаеш, як не трэба шукаць шчасця там, дзе яго няма» — гэтыя радкі з анатацыі да зборніка вельмі ёміста, хоць, на першы погляд, і проста, характарызуюць схаваныя ў апавяданнях сэнсы.

Жыццёвыя гісторыі з элементамі фантастыкі знойдуць водгук у аўдыторыі сучасных школьнікаў, падлеткаў і маладых людзей. Бо ў кожным творы прысутнічаюць прыгожая мастацкая мова, цікавы сюжэт і адметныя персанажы, а галоўнае, шчырыя і сапраўдныя пачуцці. Па словах аўтаркі, нельга сказаць, якое з апавяданняў кнігі ёй самой найбольш падабаецца, бо ў кожнае яна ўклала душу.

Сафію Ворсу адносяць да маладых перспектыўных аўтараў. Ужо сёння ў яе творчай скарбонцы ёсць кніга «Дзесяць першых гісторый», якая выйшла ў 2017-м, а пасля была перакладзена на японскую мову, потым свет убачыла кніга «Горад асляплых скрыжаляў» (2018), а ў 2019 з'явілася ў выглядзе кнігі-перакруткі яе п'еса «Дзень настаўніка»... Сёння юная пісьменніца мае розныя літаратурныя прэміі, публікацыі ў літаратурных часопісах Беларусі, Расіі, Літвы, Японіі, Польшчы. Але пры гэтым досыць ціпла ацэньвае свае здабыткі.

Кожная з гісторый, што ажываюць у новай кнізе «Рыба», мае свой настрой і скіроўвае да роздумаў. «Чалавек за аблокамі» — дае магчымасць здзейсніць падарожжа ў горы і зрабіць там у кампаніі галоўнай герaіні незвычайныя адкрыцці. Апавяданне «Рыба» — пераносіць у фантастычны свет, у якім не існуе нічога немагчымага. Пра жыццё дзяцей-сірот, якія сыходзяць з прытулку і трапляюць у кампанію жабракоў, можна даведацца з гісторыі «Бегункі». Твор «Update» — гэта пагружэнне ў экзістэнцыяльныя разважанні галоўнага героя. Апошнім у зборніку змешчана апавяданне «Пошукі разумення», пасля знаёмства з якім, магчыма, і ў чытачоў узнікнуць падставы для роздумаў пра сэнс жыцця і смерці.

— Я хутка пісала гэтыя апавяданні, але сама на працягу некалькіх гадоў перажывала ўсё тое, што там апісана. Веру, што і чытачы змогуць з дапамогай маіх твораў стаць адкрывальнікамі іншага свету, — адзначае юная пісьменніца. — Зборнік быў створаны за тры месяцы. Ён пісаўся фрагментамі, якія часам узнікалі як запісы ў сшытках, на сурвэтках, з'яўляліся ў розных месцах — і ў цягніках, і ў падарожжы па гарах, і ноччу на кухнях у розных краінах свету, але адзіным цэлым усё гэта стала дома.

**Алена ДРАПКО.**

Духоўны свет

*Наша новая рубрыка — своеасаблівы даведнік, які зробіць чытачоў больш дасведчанымі ў пытаннях хрысціянскага веравызнання, дапаможа глыбей зразумець абрады і таінствы праваслаўнай царквы, а, магчыма, развянчае некаторыя міфы.*

# ДЫ ЗБАІЦЦА ЖОНКА... СТРАЦІЦЬ МУЖА СВАЙГО

**Захаваць любоў да глыбокай старасці — традыцыйнае пажаданне маладым на вяселлі. На жаль, шлюб часта руйнуюць бытавыя праблемы, крыўды, няўменне дараваць і саступаць адно аднаму. Як пабудаваць адносіны ў сям'і, каб шлюб быў шчаслівы і моцны? Гэтым разам такое пытанне мы адрасуем не сямейнаму псіхолагу, а святару. Пра тое, што такое хрысціянская сям'я, мы размаўляем з настаяцелем прыхода храма Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, святаром Аляксандрам (Пальчэўскім).**

## «Малая царква»

***— Лічыцца, што ў Свяшчэнным Пісанні ёсць адказы на ўсе пытанні. Але не заўсёды за старадаўнімі фармулёўкамі свецкі чалавек можа разглядзець сутнасць. Аб шлюбе ў кананічных тэкстах сказана: «Ды збаіцца жонка мужа свайго». Чаму выкарыстана менавіта гэтае слова, і як цытату варта разумець?***

— Перш за ўсё, трэба сказаць, што любая фраза, выраз або цытата са Свяшчэннага Пісання павінны разбірацца ў кантэксце. Тэкст, з якога ўзятая гэтая цытата, чытаецца падчас здзяйснення таінства вянчання, і часта людзі звяртаюць увагу на гэтую фразу і ставяцца да яе з насцярожанасцю і неразуменнем. Чаму трэба «баяцца» мужа свайго, чаму не любіць, паважаць, шанаваць? На гэтае пытанне ёсць адказ, калі мы звернемся да кантэксту. Поўная цытата гучыць так: «Мужы, любіце сваіх жонак, як і Хрыстос палюбіў Царкву... Так павінны мужы любіць сваіх жонак... Так кожны з вас ды любіць сваю жонку, як самога сябе; а жонка ды збаіцца свайго мужа».

Адносіны ў шлюбе паміж мужчынам і жанчынай у праваслаўі прынята параўноўваць з адносінамі Ісуса Хрыста і Царквы. Невыпадкова ў хрысціянстве сям'ю прынята называць «малой царквой». Гэта значыць, адносіны ў сям'і паміж мужам і жонкай павінны выбудоўвацца па вобразе адносін царкоўных. Па азначэнні апостала Паўла, Царква — гэта Цела Хрыстова. Калі ўдумацца, гэта вельмі глыбокае азначэнне. Цела — гэта жывы арганізм, які павінен развівацца, дзе кожны член Царквы — гэта важная і неабходная частка гэтага арганізма, цесна звязаная з іншымі часткамі. Так і ў сям'і — для яе правільнага развіцця павінен працаваць кожны, хто ў яе ўваходзіць. Ну, а наконт слова «збаіцца»... Калі муж будзе любіць сваю жонку, як самога сябе, і клапаціцца пра яе — напэўна, такога мужа жонка будзе баяцца расчараваць і страціць. Гэта самае даступнае і правільнае тлумачэнне згаданай цытаты: мужчына ў сям'і павінен паводзіць сябе так, каб жанчына баялася яго страціць.

***— Такім чынам, гармонія ў сям'і ў першую чаргу залежыць ад мужчыны?***

— Пабудова гарманічнай (хрысціянскай) сям'і залежыць, паўтаруся, ад усіх яе ўдзельнікаў. Але, сапраўды, згодна з дактрынамі праваслаўя, мужчына — гэта галава сям'і. І ў канчатковым выніку з яго спытаецца больш, чым з жанчыны. Так, сям'я іерархічная. Але гэта правільна — бо гэта ж «малая царква». А ў Царкве ёсць пэўная іерархія, ступені святарства. Ёсць епіскап, святар, дыякан, і кожны выконвае свае функцыі. Калі ёсць іерархія, кожнаму прасцей зразумець, які ўклад ён можа ўнесці ў агульную справу.

***— Што павінен рабіць мужчына як галава сям'і? Наогул, слова «павінен» тут правамернае?***

— Так, у мужчыны ёсць доўг, адказнасць перад сваёй сям'ёй. Гэта і матэрыяльнае забеспячэнне, і выхаванне дзяцей, і многае іншае. Але гэты рух не можа быць аднабаковы. Як муж павінен любіць сваю жонку, клапаціцца пра яе, ісці насустрач, дараваць і падтрымліваць, так і жонка павінна рабіць тое ж самае. Існуюць укладзеныя Богам у паняцце сям'і і шлюбу асновы і прынцыпы. Гасподзь стварыў Адама і Еву з яго рабрыны (з арыгінальнага тэксту слова «рабрына» можна пераклàсці таксама як «бок» альбо «грань»), каб жанчына была памочніцай мужчыны.

***— Сёння часта ролі мужчыны і жанчыны ў сям'і мяняюцца. Часам бацька знаходзіцца ў водпуску па доглядзе за дзіцем, а жанчына зарабляе і забяспечвае сям'ю. Царква лічыць, што гэта няправільна?***

— Царква не дае гатовых рэцэптаў і рэкамендацый. У кожнага чалавека ёсць асаблівасці, таленты, рысы характару. З хрысціянскага пункту гледжання, калі ў такой сям'і ёсць любоў і кожнага задавальняе яго роля, супярэчнасці тут няма. Гэта не пытанне духоўнага жыцця. Іншая справа, калі ўсе мэты і каштоўнасці жонкі ляжаць па-за сям'ёй і адарваныя ад мужа і дзяцей — вось гэта няправільна з пункту гледжання праваслаўя. Або калі, напрыклад, пара, знаходзячыся ў шлюбе, адмаўляецца ад магчымасці нарадзіць дзяцей, пры тым што ім нішто не перашкаджае выканаць Божую запаведзь «Пладзіцеся і множцеся». Узнікае пытанне, ці трэба было гэтым людзям ствараць сям'ю.



Сям'я можа жыць поўным жыццём у Хрысце і без дзяцей, але гэта разабрацца, пра якія бяздзетныя шлюбы ідзе гаворка: муж і жонка не могуць мець дзяцей — або не хочуць? Калі не хочуць і імкнуцца пажыць для сябе, Царква не падзяляе такога стаўлення да жыцця.

## Далучыцца да Боскай Любові

— Царква разумее сям'ю як адну з магчымасцяў, што даецца чалавеку, каб спазнаць Бога і раскрыць Боскі патэнцыял, які закладзены ў кожнага з нас. Гэта найважнейшая задача ў жыцці чалавека, які створаны па вобразе і падабенстве Божым і чыё жыццё не завяршаецца пасля смерці — далучыцца да Боскай Любові і набыць гармонію ў адносінах з Богам і людзьмі. Хрысціянская сям'я павінна прытрымлівацца гэтай мэты — спазнаваць Бога і рэалізоўваць Божую задуму.

***— Сям'я — гэта неабходнасць выхоўваць дзяцей. Як гэта рабіць правільна?***

— Царква вучыць, што перш за ўсё адносіны з дзецьмі варта будаваць на прынцыпах даверу. Безумоўна, маці і бацька павінны пастарацца стаць яшчэ і сябрамі сыну або дачцэ, каб дзіця давярала бацькам і не баялася расказаць пра нешта патаемнае. Узровень блізкіх адносін з бацькамі закладваецца з дзяцінства і мае патрэбу ў пастаянным падтрыманні. Але разам з тым вельмі важна выхоўваць у дзецях уменне паважаць старэйшых. І тут мы вяртаемся да паняцця іерархіі, якая неабходна і якой часам так не хапае ў сучаснай сям'і. А наогул, у выхаванні дзяцей, на мой погляд, нам варта павучыцца ў нашых бабуль і дзядуляў — успомніце, як раней выстройваліся адносіны «бацькі — дзіця», якая была павага да старэйшых! Пагаварыўшы з вашымі бацькамі аб іх дзяцінстве, магчыма, вы многае для сябе запазычыце.

***— Ці трэба караць дзяцей?***

— У рускай мове словы «наказание» і «наказ» (настаўленне) — аднакарэнныя. З боку бацькоў пакаранне не павінна быць праявай сілы і жорсткасці. У першую чаргу патрэбны разбор сітуацыі, размова аб правіне дзіцяці на адкрытым, даверным узроўні.

## Любоў як штодзённая праца

***— Як з пункту гледжання хрысціянства варта выбудоўваць адносіны ў сям'і — давайце пагаворым аб практычных рэкамендацыях...***

— Гэта будаўніцтва пачынаецца з таінства шлюбу. Да шлюбу людзі часта падыходзяць фармальна — проста як да прыгожага абраду. Акрамя таго, існуе перакананне, што, прыняўшы ўдзел у таінстве вянчання (або ў любым іншым), чалавек аўтаматычна атрымлівае удзел у... 

— Гэта будаўніцтва пачынаецца з таінства шлюбу.

# ГУЛЬНІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ,

## ці Пясочныя карціны як люстэрка душы

**У чым карысць пясочнай тэрапіі? Чаму яна ўсё часцей выкарыстоўваецца не толькі ў рабоце з дзецьмі, але і з дарослымі? Пра гэта наша размова з псіхолагам Студыі сямейнага развіцця, кіраўніком аддзялення Асацыяцыі пясочнай тэрапіі ў Беларусі Наталляй САКОВІЧ.**



— Sand play — гэта псіхатэрапеўтычны метад зняцця ўнутранага напружання, псіхалагічнага дыскамфорту пры дапамозе занятkaў з пяском, — уводзіць у курс справы Наталля Аляксандраўна. — У падносе (латку) з вільготным або сухім пяском, выкарыстоўваючы мініяцюрныя аб'екты, фігуры, кліент стварае карціны. З дапамогай актыўнага ўяўлення і творчай сімвалічнай гульні ўвасабляюцца свядомыя і несвядомыя думкі і пачуцці паміж імі, а таксама ствараецца мост паміж рацыянальным і эмацыянальным, духоўным і фізічным, невербальным і вербальным.

Цяжкасці, боль, канфлікты, якія часта складана выказаць словамі, з дапамогай пясочнай тэрапіі выяўляюцца ў вобразах, якія можна разглядаць, адчуваць, змяняць, абмяркоўваць і фатаграфаваць. Выводзячы вонкі і матэрыялізуючы мінулы вопыт або траўмы, з дапамогай спецыяліста можна эфектыўна вырашыць звязаныя з імі праблемы, пазбавіцца ад фізічнага болю і духоўных, маральных пакут.

***— Гэта значыць, гульня з'яўляецца аздараўляльнай?***

— Так. Карл Юнг казаў: «Душа натуральна рухаецца да вылячэння і цэльнасці». У працэсе гульні з пяском і вобразамі актывізуюцца прыроджаныя рэсурсы, чалавек пачынае лепш разумець сябе, і ад адчування «пацярпелага» рухаецца да адчування сябе «стваральнікам» уласнага жыцця.

***— Чаму ўсё ж для тэрапіі выбраны такія матэрыялы, як пясок і вада?***

— Паднос з пяском нагадвае пра мінулы вопыт (тыя пясочніцы, у якіх мы ўсе гулялі маленькімі), прыадчыняе дзверы ў дзяцінства, абуджае «ўнутранае дзіця», жаданне гуляць. Пясок мае моцныя медытатыўныя ўласцівасці. Невыпадкова тыбецкія манахі шмат стагоддзяў ствараюць з рознакаляровага пяску магічныя колы — мандалы, дасягаючы дасканаласці і духоўнай гармоніі. У Кітаі, Індыі і Японіі посуд з пяском размяшчаюць каля ўвахода ў дом. Уваходзячы і выходзячы, чалавек апускае туды рукі, каб ачысціцца ад дрэнных думак і небяспечных пачуццяў. Вада ачышчае і адначасова дае жыццё. Часта яна сімвалізуе несвядомыя эмоцыі і стан. Пясок і вада звязваюць думкі і дух з фізічным целам, забяспечваючы магчымасць уплываць адно на аднаго свядома і падсвядома.

***— Чым дыктуецца выбар мініяцюр?***

— Мініяцюры (фігуркі людзей, казачных істот, герояў фільмаў і коміксаў, жывёл, раслін, транспартных сродкаў, будынкаў і г. д.) — гэта сімвалы свядомых і несвядомых працэсаў. Чым большая і разнастайнейшая калекцыя, тым больш багаты і творчы можа быць працэс будавання кліентам свайго свету. Яго рука беспамылкова пацягнецца да тых аб'ектаў, выбудуе з іх тыя карціны, якія адлюстроўваюць яго праблемы.

***— Каму, у якіх выпадках можна рэкамендаваць пясочную тэрапію?***

— Усім, хто мае патрэбу ў самавыяўленні, самаактуалізацыі, самараскрыцці, зняцці ўнутранага напружання. Хоць пясочнай тэрапіяй звычайна займаюцца псіхатэрапеўты і псіхолагі, але яе мадыфікацыі з поспехам выкарыстоўваюць настаўнікі, дэфектолагі, сацыяльныя супрацоўнікі. Гэта тэхніка ўжываецца ў клініках, школах і дзіцячых садках; цэнтрах карэкцыйна-развіццёвага навучання, псіхалагічных кансультацыях пры загсах.

***— Гэты метад прымяняецца для псіхакарэкцыі і дзяцей, і дарослых? Ён строга індывідуальны або дапускае групавыя заняткі?***

— Спачатку пясочная тэрапія ўжывалася ў асноўным у рабоце з дзецьмі. Але ў апошнія дзесяцігоддзі з'явілася асаблівая ўвага да «ўнутранага дзіцяці» кожнага чалавека. Псіхолагі і псіхатэрапеўты сталі выкарыстоўваць гульнявую тэрапію для работы з дарослымі, каб вызваліць творчы патэнцыял, унутраныя пачуцці. Магчыма, гэта звязана з тым, што многія з нас недастаткова гулялі ў дзяцінстве. Сёння ўжо дакладна вядома аб эфектыўнасці Sand play не толькі ў індывідуальных занятках, але і ў рабоце з парамі, сем'ямі, на групавых трэнінгах. Прычым яе можна сумяшчаць з гештальт-тэрапіяй, візуалізацыяй, псіхадрамай, работай з целам і рухам, кагнітыўнай псіхатэрапіяй, гіпнозам і г. д. Ужываючы пясочную тэрапію, дзіўлюся рэсурсам нашай псіхікі, таму, што ў ёй ёсць усе адказы — трэба толькі гэта ўсвядоміць.

***— Колькі гадоў у нас існуе пясочная тэрапія? Якія якасці і навыкі неабходныя, каб эфектыўна выкарыстоўваць яе?***

— Падрыхтоўку спецыялістаў пачалі яшчэ ў 2002 годзе, калі я атрымала сертыфікат Ірландскага інстытута пясочнай тэрапіі. Каб з поспехам прымяняць гэты метад, неабходна добра ведаць і разумець усе этапы развіцця чалавека, развіцця яго псіхалагічных працэсаў, мову калектыўнага несвядомага, архетыпаў, вобразаў і знакаў. А яшчэ важна мець уяўленне аб целе, органах і саматычных хваробах. Псіхолаг павінен праяўляць цікавасць да даследавання і свайго ўласнага «саду душы», жаданне будаваць уласны свет, рухацца да цэльнасці і індывідуалізацыі. Выбудоўваючы пясочныя сусветы, спецыяліст становіцца ў пазіцыю кліента. Гэта развівае здольнасць да разумення таго, што адчуваюць людзі, якія звяртаюцца па дапамогу.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

Аднойчы мама прывяла на прыём да псіхолага 12-гадовага Паўла ў сувязі з частымі прагуламі школьных заняткаў, грубасцю і нежаданнем што-небудзь рабіць.

Размова з хлопчыкам выявіла: тры месяцы таму бацькі развяліся. Да калекцыі фігур і прапановы пабудаваць нешта з пяску Паша паставіўся з цікаўнасцю. На працягу трох-пяці хвілін ён надаваў пяску форму, то выраўноўваючы яго, то ствараючы на ім грабяні. Затым узяў ваду і выплюхнуў яе ў цэнтр, назіраючы, як яна ўсмоктваецца ў пясок. Фігуры Паша выбіраў па адной.

Увесь час будаўніцтва хлопчык маўчаў, а калі скончыў, пачаў расказваць: «Гэта мёртвае мора. Усё, што раней жыло ў ім, — памерла. Гэта людзі забрудзілі яго. Яны кідалі ў мора пустыя пачкі з-пад цыгарэт, пустыя бутэлькі і смецце. Чэрап — гэта памерлы чалавек, дакладней тое, што ад яго засталося...»





Нататкі шматдзетнага таткі

# ДАРОСЛЫЯ ГУМАРУ НЕ ЗРАЗУМЕЮЦЬ...

Сын вярнуўся з рэпетыцыйнага тэсціравання па рускай. Жонка пытаецца:

— Ну як напісаў?

— Калі пяцьдзясят балаў са ста набяру, будзе добра.

Я:

— А калі шэсцьдзясят?

— Увогуле выдатна.

— А калі семдзесят?

— Калі семдзесят... значыць маю работу з чыёйсьці пераблыталі.

(Так, сынок, руская мова — гэта табе не фізіка, тут з наскоку здаць не атрымаецца.)

* * *

Распачалі днямі невялікую перастаноўку мэблі на кухні (усё яшчэ адаптуемся да новай кватэры). Вечарам прыйшоў з ліцэя сын, пытаюся ў яго:

— Ну як табе такая расстаноўка?

Ён паглядзеў і кажа:

— Такое.

Я, не разумеючы:

— Якое «такое»?

— Ну такое.

Кажу яму:

— А нармальна можна сказаць?

— Дык я табе і сказаў нармальна.

Каб разрадзіць абстаноўку, у размову ўмешваецца жонка:

— Гэта на іх жаргоне азначае штосьці накшталт «так сабе».

Кажу сыну:

— Ну так бы і сказаў: «Так сабе».

Сын яхідна:

— А «так сабе» гэта як сабе?

Спачатку я проста махнуў рукой, а потым задумаўся: а сапраўды, «так сабе» гэта як сабе? І прычым тут увогуле «сабе»?

Карацей, такое...

* * *

Перапіс праз пару дзён заканчваецца, а нас пакуль так і не перапісалі. Я ўжо пачаў рэальна хвалявацца.

І вось сёння вечарам нарэшце доўгачаканы званок у дзверы. Адчыняю, у тамбуры стаіць хлопец з кіпай лісткоў.

Хлопец дзелавіта:

— Добры дзень, гэта кватэра нумар..?

— Так.

— Колькі чалавек у кватэры пражывае?

— Сем.

— А колькі з іх карыстаюцца інтэрнэтам?

(Перапіс XXI стагоддзя! Пачынаюць не з імёнаў, а з колькасці інтэрнэт-юзераў.)

Адказваю:

— Чацвёра.

Хлопец:

— Ну што ж, можам прапанаваць вам тарыфны план «Дамашні 70», хуткасць 70 мегабіт у секунду, на вашу сям'ю будзе цалкам дастаткова.

Я збянтэжана:

— А вы хто?

— Інтэрнэт-правайдар «А1», былы «Вэлком», праводзім оптыку ў вашым доме.

Заслона.

* * *

Цікава ў нас малодшая дачка будуе фразы з адмаўленнем: спачатку гаворыць быццам бы сцвярджальную фразу, а потым дадае «не»: «Я хачу спаць не!» або «Я буду есці кашу не!»

Калі ты ёй гаворыш, напрыклад, «я табе не ўключу мульцікі» — яна проста хныча і просіць уключыць. Але калі будуеш фразу на яе манер: «Я табе ўключу мульцікі не!» (з націскам на «не») — у момант істэрыка, то-бок даходзіць значна хутчэй.

Я нават у дачыненні да старэйшых дзяцей стаў практыкаваць падобную пабудову сказаў: спачатку ты быццам бы пагаджаешся з іх просьбай «я вам дам пяць рублёў», а потым дадаеш «не!», і адразу сэнс мяняецца на 180 градусаў. Крута!

*P. S. Цікава было б выпрабаваць гэты метад на дарослых, але, баюся, дарослыя гумару не зразумеюць. Для іх лепш «не», наадварот, наперад выносіць, каб адразу не было ніякіх ілюзій.*

* * *

Прыйшоў дадому, адчыняе дзверы Поля:

— Прывітанне, як табе мая новая прычоска?

Я:

— Ваў, супер!

І потым ціха, каб ніхто не пачуў:

— А хто яшчэ, акрамя цябе, пастрыгся?

— Усе.

— І мама?

— Так.

— І Ксенія?

— Я ж сказала: усе.

Уваходжу ў кватэру і пачынаю па чарзе любавацца ўсімі прычоскамі — як-ніяк у доме пяць жанчын, і ўсе пастрыгліся!

(Гэта, дарэчы, зручна, калі ўсе адразу стрыгуцца — адзін раз пазахапляўся ад душы і некалькі месяцаў свабодны.)

*P. S. Асобны дзякуй Полі, што падзялілася інфармацыяй, бо сам я толькі па сыне бачу, калі ён пастрыгся. Але ён чамусьці ніколі не пытаецца маёй думкі на гэты конт.*

**Павел ХОЛАД.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Продавец – ОАО «ОРС Гомель».**
**Оператор – «Единая система электронных торгов» torgi.gov.by**

**Предмет электронных торгов и его месторасположение**

**Лот № 1**. Изолированное помещение инв. № 350/D-357559, расположенное по адресу: **г. Гомель, ул. Советская, 97/4-107,** общая площадь – 496,9 кв. м. Назначение – торговое помещение.
Договор аренды на банкомат № 2/582 от 30.04.2019.
**Лоту принадлежит оборудование:**
кондиционер Ballu BCFB, инв. № 346181; кондиционер ASH 30R/AOH-302, инв. № 416111; кондиционер SH 30R/AOH-302, инв. № 416109; система охранной сигнализации, инв. № 347249; система видеонаблюдения, инв. № 346204; система пожарной сигнализации, инв. № 346205; холодильная камера KXH-4SP, инв. № 43779; холодильная камера KXH-4SP, инв. № 43780.
**Информация о земельном участке**:
кадастровый номер 340100000001001120, площадью 0,2642 га, (доля в праве 73/1000).
Договор аренды на земельный участок № 3622 от 31.03.2008 г.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 934 742,09 руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости 93 474,21 руб.**

**1. Электронные торги состоятся 18.02.2021 на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by**.
2. Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», размещенным на сайте: torgi.gov.by
3. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
4. Последний день подачи заявлений – 17.02.2021.
5. Шаг аукциона 5 % от начальной цены предмета торгов.
6. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат согласно прейскуранту торговой площадки в течение пяти календарных дней со дня проведения торгов.
7. После совершения победителем торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов с продавцом заключается договор купли-продажи имущества.
8. Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел.: +37529 6672143; +37529 6019210.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2021.Б.002.00004

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

| № лота | Наименование | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Минимальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Вкладыш конический (запасная часть на вакуумную камеру), лот № 2/08-2020 | 11 500,00 | 9 200,00 |
| 2 | Вставка 38х25 (запасная часть пресса для изготовления кирпича), лот № 3/08-2020 | 4 000,00 | 3 200,00 |
| 3 | Пустообразователь 2.12 NF (запасная часть пресса для изготовления кирпича), лот № 4/08-2020 | 8 900,00 | 7 120,00 |
| 4 | Пустообразователь 25х12 (запасная часть пресса для изготовления кирпича), комплект кернов 25х12, лот № 5/08-2020 | 8 042,50 | 6 434,00 |
| 5 | Преобразователь частоты TOSHIBA 30КВт VFP7-4300P, инв. № 501372, лот № 6/08-2020 | 3 300,00 | 2 640,00 |
| 6 | Преобразователь частоты TOSHIBA VF-P7 160КВт, инв. № 501002, лот № 7/08-2020 | 12 200,00 | 9 760,00 |
| 7 | Преобразователь частоты TOSHIBA VF-P7 160КВт, инв. № 500956, лот № 8/08-2020 | 12 200,00 | 9 760,00 |
| 8 | Кран консольно-козловой ККТ-5-16-7,1, инв. № 744, лот № 9/08-2020 | 6 200,00 | 4 960,00 |

Имущество, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, 47.

Условия электронных торгов: победитель (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан возместить затраты по оценке приобретенного имущества.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения: нет.

Дата и время начала и завершения электронных торгов: **09.03.2021 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by/.

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ **с 9.00 05.02.2021 по 16.00 05.03.2021.**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by/ необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.00 05.03.2021.

**Задаток по лоту № 1** в сумме 1 150,00 (одна тысяча сто пятьдесят рублей 00 копеек), **задаток по лоту № 2** в сумме 400,00 (четыреста рублей 00 копеек), **задаток по лоту № 3** в сумме 890,00 (восемьсот девяносто рублей 00 копеек), **задаток по лоту № 4** в сумме 804,25 (восемьсот четыре рубля двадцать пять копеек), **задаток по лоту № 5** в сумме 330,00 (триста тридцать рублей 00 копеек), **задаток по лоту № 6** в сумме 1 220,00 (одна тысяча двести двадцать рублей 00 копеек), **задаток по лоту № 7** в сумме 1 220,00 (одна тысяча двести двадцать рублей 00 копеек), **задаток по лоту № 8** в сумме 620,00 (шестьсот двадцать рублей 00 копеек) должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Справочная информация**

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 17 374 23 93.

Контактный телефон для осмотра объектов + 375 (44) 793 63 11.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения, 8 (0212) 42-60-11, 8 (029) 884-96-79.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов **с 05.02.2021 по 05.03.2021 с 09.00 до 17.00** по месту нахождения имущества по предварительному согласованию.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно сметы затрат и прейскуранта ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by/до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА 9 МАРТА 2021 ГОДА

**Лот № 1*.** Капитальное строение, инв. № 400/С-24085. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад. Площадь – 220,70 кв. м, 1984 года постройки. Отдельно стоящее кирпичное здание. Расположено на земельном участке 440100000001010157.
Адрес (местоположение): г. Гродно, ш. Скидельское, 8/6

| **Начальная цена** | **31 860,0 руб.** | *Сумма задатка* | *3 000,0 руб.* |
|---|---|---|---|

**Лот № 2*.** Капитальное строение, инв. № 400/С-124583. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие (А), цементобетонное покрытие (Б). Площадь – 8176,1 кв. м, 1984 года постройки. Расположено на земельном участке 440100000001010157.
Адрес (местоположение): г. Гродно, ш. Скидельское, 8, благоустройство

| **Начальная цена** | **836 100,0 руб.** | *Сумма задатка* | *83 600,0 руб.* |
|---|---|---|---|

**Лот № 3*.** Капитальное строение инв. № 400/С-124561. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение. Составные части и принадлежности: ограждение (А). Площадь – 565,2 кв. м, 1984 года постройки. Железобетонные панели со столбами ограждения. Расположено на земельном участке 440100000001010157.
Адрес (местоположение): г. Гродно, ш. Скидельское, 8, ограждение

| **Начальная цена** | **7 038,0 руб.** | *Сумма задатка* | *700,0 руб.* |
|---|---|---|---|

** – Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.*

Імунітэт пакуль выратоўвае: суразмоўніца кажа, што на ковід не хварэла — ні ў першую, ні ў другую хвалі.

З тканіны або медыцынскія? Урачы пішуць пра тое, што медыцынскія маскі больш эфектыўныя, чым павязкі з тканіны. Маска з матэрыі не можа затрымаць усе ўзбуджальнікі інфекцыі, але яна ўсё ж спыняе некаторыя з іх. Так што і гэта таксама абарона, асабліва калі гаворка ідзе пра распаўсюджванне віруса заражаным чалавекам. Сёння моладзь і наогул модныя гараджане рознага ўзросту імкнуцца ўпісаць маску ў свой вобраз, калі ўжо яна з намі надоўга. А крамы адзення прапануюць прыгожыя, стыльныя і аптымістычныя варыянты масак: мода заўсёды чуйна рэагуе на любыя падзеі, і «карона» таксама спарадзіла трэнд — на маскі. Сёння моднікі ў масках розных колераў, з прынтамі, надпісамі і нават паеткамі нікога не здзіўляюць. Каштуюць такія фэшн-маскі ў сярэднім 10 рублёў.

— Не ведаю, колькі працэнтаў абароны могуць забяспечыць маскі, але я купіла некалькі штук. Па-першае, без іх амаль нікуды не пускаюць, а па-другое, мне падабаецца, як я ў іх выглядаю, — кажа Лізавета. Ліза — дзесяцікласніца, і яшчэ адзін яе аргумент на карысць масак — «І мама не так хвалюецца, што я магу захварэць на ковід».

Адзіныя грамадскія месцы, як быццам перанесеныя ў нашы дні з 2018-га — гэта кафэ і рэстараны. За столікамі — людзі з адкрытымі тварамі. Згодна з патрабаваннямі масачнага рэжыму, пры наведванні рэстаранаў і кафэ без маскі можна знаходзіцца, толькі пакуль вы ясце. Але часам так прыемна ўсміхнуцца суразмоўніку не толькі вачыма!

**Дзіяна РОНІНА.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр-т Пушкина, д. 70. Тел. +375 17 259-18-53** |

**Предмет аукциона: оборудование, бывшее в употреблении.**
**Месторасположение: г. Минск, пр. Пушкина, д. 70**

| Лот № | Наименование | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Стан СП-2000, инв. № 41008 | 858 600.00 | 42 930.00 |
| 2 | Станок Hedelius-CB 80 Magnum, инв. № 70147 | 237 600.00 | 11 880.00 |

Лоты находятся в залоге

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию. Тел.: +375 (29) 331 11 14 (Максим Станиславович), + 375 (29) 190 56 39 (Кирилл Владимирович)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.

С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику, при его согласии, по начальной цене увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок заключения договора купли-продажи** | **10 (десять) дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **09.03.2021 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата, время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 05.02.2021 до 17.00 05.03.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны:**
**+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

---

**ОАО «Управление специальных строительных работ**

## Стройтрест № 7»

**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 15 февраля 2021 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ**

1. Увеличение уставного фонда ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7» за счет собственного капитала (фонда переоценки в полном объеме и части нераспределенной прибыли) путем увеличения номинальной стоимости акции.
2. Внесение изменений в устав ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».

Место проведения собрания: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5.
Начало работы собрания в 11.00.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания по месту его проведения. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 1 февраля 2021 г.

Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 29.01.2021 № 29-01/2021.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 01.02.2021, по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5.

***Совет директоров***
***ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».***

УНП 100088916

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Торговый дом «Речицкий» (арендодатель) извещает о проведении 26 марта 2021 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование и адрес лота | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС 20 % | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | **Часть изолированного нежилого здания площадью 127,8 кв. м** (помещение, не относящееся к жилищному фонду, с инв. № 350/D–263630, помещение на 1-м этаже). **Местонахождение:** г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61-1. Арендная плата в месяц – **1 749,45 бел. руб.** (с учетом НДС 20 %). Коэффициент спроса – **3,0**. Базовая ставка – **0,3**. Коэффициент местоположения – **0,9**. **Цель использования:** организация розничной торговли, общественного питания (кафе, бар), размещение офиса. **Срок аренды – 3 (три) года** | **539,96** | 54,00 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце** | ОАО «Торговый дом «Речицкий», г. Гомель, проспект Речицкий, д. 61. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (0232) 50-32-71, Пикулина Нина Альбертовна** |
| **Срок подачи заявления** | **С 04.02.2021 г. по 24.03.2021 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-услуга» **(предварительно по контактным телефонам Организатора торгов)**. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) календарных дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | расчетный счет **Продавца (ОАО «Торговый дом «Речицкий»):** BY56 BLBB 3012 0400 0540 0000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, код банка BLBBBY2X, УНП 400054000, ОКПО 14458671, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Размер штрафа** | **6 (шесть) базовых величин**, согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) |

**Шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить следующие документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представитель юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола оплатить Организатору аукциона по результатам аукциона вознаграждение в размере **10 (десять) % от цены продажи Объекта** (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка РБ на дату подписания протокола о результатах аукциона), в том числе затраты на публикацию извещения в газете «Звязда» от 04.02.2021 г. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **5 (пяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www. expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

---

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ГЛХУ «Березинский лесхоз», 223311, Минская обл., г. Березино, ул. Пролетарская, д. 96, тел. +375 1715 51028** |

**Предмет аукциона: спецтехника, бывшая в употреблении.**
**Месторасположение:**
**Минская обл., г. Березино, ул. Пролетарская, д. 96**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01240168 | Машина лесная, погрузочно-транспортная «БЕЛАРУС» МПТ-461.1, в составе с полуприцепом ПЛ-9 укомплектованным гидроманипулятором ГМ-42, рег. знак ОК-5 0159, 2013 г. в. | 40 920, 00 |
| 2 | 01240134 | Машина лесная, погрузочно-транспортная «БЕЛАРУС» МПТ-461.1, в составе с полуприцепом ПЛ-9 укомплектованным гидроманипулятором ГМ-42, рег. знак ОМ-5 8431, 2011 г. в. | 32 760, 00 |
| 3 | 01240130 | Трактор трелевочный ТТР-401М-05, рег. знак ОМ-5 8433, 2009 г. в. | 12 240, 00 |
| 4 | 01250054 | Полуприцеп ПЛ-9, укомплектован гидроманипулятором ГМ-42, рег. номер БЭ 0176, 2007 г. в. | 9 360, 00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. Срок внесения задатка по 05.03.2021

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609 (далее – Положение)

Извещение о проведении торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу 04.02.2021. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте cpo.by

**Дата и время проведения аукциона: 10.03.2021 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». **Дата и время окончания приема документов: 05.03.2021 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

---

## Извещение о открытом аукционе по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 9 марта 2021 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Гродненская область, г. Гродно, ул. Умелая, д. 46 (У-149, микрорайон «Погораны-Кошевники»), 440100000003003039 | 0,1308 | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, наружная площадь (площадь застройки) – 122 (122) кв. м; готовность – 12 %. Фундамент – бетон. Принадлежности: сарай площадью 46 кв. м; сарай площадью 4 кв. м | 344,28 | 32 028,75 (11 885,73; 20 143,02) | 6 000 |
| 2* | Гродненская область, г. Гродно, ул. Алексея Карпюка, д. 9 (У-366, микрорайон «Заболоть»), 440100000002007301 | 0,0903 | Не завершенное законсервированное капитальное строение, степень готовности 10 %, площадь застройки 249 кв. м. Фундамент бетонный | 218,04 | 23 724,50 (8 238,05; 15 486,45) | 4 700 |

** – Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участках отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и точки подключения определяются проектом. Земельные участки могут иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; продолжить строительство не позднее одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 9 марта 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, с 8 февраля по 2 марта 2021 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: + 375 (152) 626055, 626056, официальный сайт организатора торгов gcn.by

Крытыка

# ПРА ВЫПРАБАВАННЕ ДУХУ, ЗДРАДУ І ГОНАР

## Выйшаў новы раман Уладзіміра Саламахі

Вайна і дабрыня. Якія гэта розныя, несумяшчальныя паняцці. Але ў мінулай вайне мы перамаглі, бо, нягледзячы на ўсе невымерныя цяжкасці і страшныя выпрабаванні, дабрыні на нашай зямлі было значна больш. А гэта такая моцная сіла, якую не адолее, не скорыць нават самы люты вораг. Дабрыня яднала людзей, загартоўвала волю, вяла да чаканай Перамогі.

Раман лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Саламахі «Калі ўпадзе адзін...», які выйшаў нядаўна ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» (Мінск, 2020), прадстаўляе новы, нетрадыцыйны для беларускай літаратуры погляд на вайну і чалавека на ёй. Аўтар глыбока перакананы ў «святой неабходнасці чалавека быць памяркоўным, літасцівым, добрым і ў любых, нават самых страшных сітуацыях жыць у згодзе з усім астатнім светам».

Дзея рамана разгортваецца ў спаленай карнікамі вёсцы Гуда летам 1943 года. З першых яго старонак аўтар звяртаецца да ўжо вядомай у літаратуры тэмы трагедыі беларускіх вёсак. Як не прыгадаць тут «Хатынскую аповесць» Алеся Адамовіча? Гучаць у творы і матывы са знакамітай «Палескай хронікі» Івана Мележа, звязаныя з асаблівасцямі няпростага жыцця палешукоў, падпарадкаваных капрызам прыроды. Адчуваецца і філасофскі псіхалагізм, блізкі да прозы Васіля Быкава.

Аднак Уладзімір Саламаха з уласцівымі толькі яму творчымі почыркам і стылем па-свойму асэнсоўвае жыццё і выпрабаванні, якія даюцца чалавеку, дзе «і пакуты, і радасць ідуць абняўшыся...» Вайна, як вядома, асабліва праяўляе чалавечае нутро, выяўляе, што «не кожны з людзей чалавек па сваёй сутнасці».

Галоўныя героі рамана — бацька і сын Кучынскія. З вёскі старыя бацькі правялі сваіх сыноў на фронт, а самі, чым маглі, сталі дапамагаць партызанам. Кожны з гудняцаў памятаў словы, сказаныя старым Яўхімам у дарогу двум сынам: «Без перамогі ходу дамоў няма». І кожны сумленна ішоў праз выпрабаванні пакручастага лёсу абаронцаў Айчыны, дастойна выконваў свой сыноўні абавязак.

Сярод тых, хто пайшоў ваяваць, быў і Стас Кучынскі. Але неўзабаве ён вярнуўся дамоў, «знюхаўся з немцамі» і стаў пярэваратнем-паліцаем. Спрабаваў наводзіць у вёсцы свае парадкі, удзельнічаў у яе знішчэнні, яшчэ і пасля нарабіў шмат бяды. Пакаранне, якое чакала здрадніка, вядомае: па ўсёй строгасці закона.

А як жыць бацьку, які ніколі нікому не ўчыніў зла, наадварот, заўсёды спрыяў людзям і цяпер гатовы несці цяжар агульнага крыжа? Аднак «ён нават спінай адчуваў пагардлівыя позіркі землякоў, а хто-ніхто нават пляваў яму ўслед». Старому было вельмі цяжка, чужая нянавісць наскрозь прапальвала ўсю яго істоту. «Адкуль узялося гэта нейкае чортава семя?» — дакараў сябе Іосіф за роднае дзіця. Ён разумеў, што сухое дрэва неабходна спілаваць. Але ж корань яно мае ягоны. І ад гэтага нікуды не падзецца.

Як быццам па законе ніхто за Іосіфам віны не прызнаваў. Не нясе бацька за сына адказнасці. Але здрадзе няма аніякага апраўдання. «Зло ёсць зло. Ад яго слепнеш. Яно жывучае». Іосіф думаў і пра тое, што пакараны адседзеў сваё і вярнуўся. Нібыта і няма ўжо той віны, скасаваў яе. Але людское асуджэнне — самы высокі суд, «ад якога і сэрца сыходзіць крывёй, і душа нясцерпна баліць». Іосіфу здавалася, што людзі асуджаюць яго на вечную адзіноту, адыходзяць ад яго назаўсёды. Навошта такое жыццё? Неадчэпная думка трывожыла чалавека, які сумленна пражыў свой век. Аўтар разам са сваім пакутным героем спрабуе шукаць шляхі вратавання ад бяды старога чалавека.

Раман «Калі ўпадзе адзін...» адметны, бо складаецца з трох аповесцяў, напісаных пісьменнікам у розны час. Але нягледзячы на гэта, яны настолькі гарманічна дапаўняюць адна адну, узаемазвязаныя паводле свайго зместу, што атрымліваецца аб'ёмнае мастацкае палатно. Шматлікія героі выяўляюць свае жывыя характары, здзяйсняюць неверагодныя ўчынкі. Аповед апісвае сем гадоў шматгранната жыцця людзей беларускай глыбінкі. Вялікая псіхалагічная напружанасць, якая захоплівае чытача ўжо з першых старонак, падтрымлівае яго шчырую цікавасць да канца рамана.

Сам аўтар прызнаецца ў жыццёвай аснове таго, што адбываецца з героямі кнігі. Уладзімір Саламаха нарадзіўся ў 1949 годзе ў вёсцы Бераснёўка Кіраўскага раёна, што на Магілёўшчыне. Карнікі ў гэтых мясцінах спалілі 579 паселішчаў. Палалі і кіраўскія вёскі. У дзяцінстве будучаму пісьменніку давялося не столькі слухаць казкі, як чуць яшчэ вельмі свежыя трывожныя ўспаміны родных, аднавяскоўцаў пра перажытае, пра тое, якое гэта страшнае ліха — вайна.

Таленавіты юнак рана ўзяўся за пяро. Цяпер Уладзімір Пятровіч згадвае пра тое, як астуджалі яго запал старэйшыя людзі, прасілі, каб не спяшаўся пісаць пра вайну. Тады ён не зусім разумеў, чаму яны стрымліваюць яго творчыя памкненні. Душу яго вярэдзіла столькі набалелага, якое неадкладна прасілася на паперу. З цягам часу, калі сам пасталеў, усвядоміў мудрасць тых людзей, якія казалі: «Судзіць лёгка — зразумець, разабрацца цяжка»...

Вайна паўсюдна выпрабоўвала дух чалавека. Напрыклад, адна з гераінь рамана, Тэкля, адпраўленая ў ссылку і збеглая адтуль, і сама нацярпелася гора, і стала сведкай шматлікіх людскіх пакут. Яна бачыла, як у гэтым горы людзі дапамагалі адно аднаму: дзяліліся апошняй крошкай хлеба, апошнім глытком вады. Таксама бачыла і такіх, хто быў гатовы адабраць апошняе ў галоднага. І адбіралі. Але сіла была не на іх баку. Выжываў, вытрымліваў той, хто верыў у дабрыню людскую. Так здарылася і з Іосіфам Кучынскім, які, на гады схаваўшыся ў лясной глушэчы, узрадваўся, калі нарэшце даведаўся, што аднавяскоўцы не трымаюць на яго злосці.

Вельмі сімвалічны ў рамане напамін, у якім, напэўна, і заключаецца сэнс чалавечай існасці: «...Калі ўпадзе адзін, то другі падніме таварыша свайго. Але гора аднаму, калі ўпадзе, а другога няма, які падняў бы яго». (Гэта аўтар узяў са Свяшчэннага пісання, з кнігі Эклезіяста або Прапаведніка, гл. 4-я). Біблейскія словы сёння гучаць надзвычай сучасна. Нішто так не ўзвышае чалавека, як уменне не азлабляцца, дараваць памылкі, аказваць падтрымку, быць міласэрным і сардэчным у сваіх памкненнях і ўчынках.

Дарэчы, раман нашага пісьменніка Уладзіміра Саламахі ў свой час быў надрукаваны асобнымі аповесцямі ў маскоўскім часопісе «Наш современник» і атрымаў высокую ацэнку ў расійскага чытача, а таксама ад некаторых вядучых расійскіх пісьменнікаў. У нас жа, напрыклад, на гэты твор звярнуў увагу рэжысёр-пастаноўшчык Беларускага радыё Алег Вінярскі. Ён па першай аповесці «...І няма шляху чужога» паставіў аднайменны трохгадзінны радыёспектакль (аўтары інсцэніроўкі У. Саламаха і Г. Шаблінская). А выдатны кампазітар Дзмітрый Смольскі, як пісала ў «ЛіМе» № 18 ад 8 мая 2015 года Галіна Шаблінская, даў згоду на выкарыстанне ў спектаклі тады толькі што напісанай ім сімфоніі, гучанне якой, па меркаванні гукарэжысёра Валерыя Бяляева, у многім адпавядала літаратурнаму твору. Згадзіцеся, ацэньваючы раман Уладзіміра Саламахі, нельга не браць усё гэта пад увагу. Тым больш што згаданы твор — яшчэ адзін напамін нам, беларусам: мы моцная нацыя, калі мы разам.

**Алена СТЭЛЬМАХ.**

# ДУХ КУЛЬТУРЫ КІТАЯ

**У Мінску досыць паспяхова працуе выдавецтва «Усходняя культура». З навінак — «Духоўныя асновы кітайскай культуры» Лоу ЮЙЛЕ ў перакладзе на беларускую мову. Перакладчык з кітайскай — А. Чэкулаеў.**




Выданне прысвечана шмат якім момантам традыцыйнай кітайскай культуры. Чытач атрымае магчымасць азнаёміцца з галоўнымі ідэямі канфуцыянства, даасізму і будызму. Аўтар закранае пытанні стаўлення ў краіне і свеце да традыцыйнай кітайскай медыцыны, якая з'яўляецца важнай часткай культуры Паднябеснай, разважае аб кітайскай рэлігіі, аб заходняй і кітайскай культурнай традыцыях, аб гуманістычным духу апошняй. Несумненна, кніга будзе карысная ўсім тым, хто цікавіцца кітайскай культурай і філасофіяй, студэнтам і выкладчыкам адпаведных дысцыплін.

«Духоўныя асновы кітайскай культуры» складаюцца з дзвюх частак: «Дух культуры Кітая» і «Развіццё «мяккай сілы» Кітая». У якасці дадатку — раздзел «Канфуцыянства, будызм і даасізм у кітайскай культуры». Дарэчы, якраз у дадатку можна прачытаць («Спадар Лоу сказаў»): «Культура — гэта двухбаковавостры нож. У ёй ёсць станоўчыя і адмоўныя бакі. Сутнасць заключаецца ў тым, якім чынам чалавек яе выкарыстоўвае». І яшчэ: «Кітайская культура робіць акцэнт на «залатой сярэдзіне», надае значэнне каардынацыі і балансу. Паміж культурамі існуе не толькі ўзаемадзеянне, але і суперніцтва»

Наклад кнігі «Духоўныя асновы кітайскай культуры» — 108 экзэмпляраў. Будзем спадзявацца, што «Усходняя культура» яшчэ вернецца да перавыдання кнігі спадара Лоу Юйле.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# Вызначаныя лаўрэаты «звяздоўскага» конкурсу апавяданняў

**Вось ужо шмат гадоў на старонках «Звязды» праходзіць конкурс апавяданняў. За гэты час у адпаведнай рубрыцы з'явілася шмат новых імёнаў — некаторыя, удала дэбютаваўшы, сталі пасля вядомымі літаратарамі. Менавіта з нашай газеты пачаўся іх шлях у вялікую літаратуру. Зрэшты, заўсёды ў «звяздоўскім» конкурсе бралі ўдзел і «мэтры», самыя вядомыя беларускія пісьменнікі, нават народныя, напрыклад, Іван Шамякін, чый стагадовы юбілей мы толькі што адзначылі.**

Літаратурны конкурс «Звязды» — гэта розныя тэмы, розны ўзрост аўтараў, розныя рэгіёны... І аднолькавая любоў да роднага слова. Больш за год доўжыўся гэты конкурсны сезон, і вы, нашы чытачы, разам з аўтарамі перажывалі іх сюжэты, спачувалі іх думкам — ці, магчыма, з нечым спрачаліся, адзначалі творчыя знаходкі, рабілі заўвагі... Ішлі шляхамі гістарычнага дэтэктыва Віктара Варанца, пагружаліся ў сюррэалістычна-імпрэсіяністычную цішу старой хаты разам з Хрысцінай Курчанковай, пранікаліся шчымлівай, лірычнай атмасферай апавядання Валянціны Чаркашынай-Ждановіч «Шампанскае, ружы і шакалад» пра маці, здзяйсніўшую навагоднюю падарожжу беларускага зефіру ажно ў Індыю ў творы Алены Стэльмах і таму, як дзякуючы аднаму слоўцу былі выкрыты нямецкія шпіёны, пра што расказаў знаўца філалогіі Уладзімір Навумовіч.

Трэба адзначыць, што публікацыя на старонках «Звязды» — гэта ўжо здзейснены конкурсны адбор, адзнака журы. Таму што, безумоўна, тэкстаў на конкурс паступае больш, чым праходзіць адбор для публікацыі. Так што мы віншуем усіх нашых аўтараў, чые творы з'явіліся на старонках «Звязды», — вы ўсе пераможцы!

Што датычыцца выбару самых адметных публікацый, на гэты раз журы, а ў ім традыцыйна прысутнічалі пісьменнікі, журналісты, супрацоўнікі «Звязды», вырашыла не падзяляць пераможцаў па месцах. Сёлета ў нас, фактычна, пяць лаўрэатаў, уключна з двума адзначанымі ў спецыяльнай намінацыі. Як самыя яркія журы адзначыла наступныя творы: апавяданне «Калі цішыня загаманіць» Хрысціны Курчанковай, апавяданне «Гарачы хлеб» Віктара Варанца і апавяданне «Выжыў» Маі Галіцкай. Спецыяльнымі прызамі за раскрыццё ваеннай тэмы ў год юбілею Перамогі адзначаны апавяданні Міхася Пазнякова «Вяртанне з фронту» і Уладзіміра Навумовіча «Доўгія шкарпэткі і паліва для аўто».

Усе апавяданні вельмі розныя і ўсе іх аўтары цікавыя. У свой час Хрысціна Курчанкова пераклала на беларускую мову Толкіена, што сведчыць пра адмысловае валоданне словам, у 2017-м у яе выйшаў зборнік імпрэсій. Мая Галіцкая, якая абрала тэмай конкурснага апавядання афганскую вайну, шмат гадоў працуе настаўніцай у Нядайскай базавай школе. Была пераможцай конкурсу на найлепшы пераклад на беларускую мову знойдзенага некалькі гадоў таму рускамоўнага верша Максіма Багдановіча. Віктар Варанец, даўні ўдзельнік «звяздоўскага» конкурсу апавяданняў, — лексікограф, выкладчык Гродзенскага медыцынскага ўніверсітэта, дзе кіруе літаб'яднаннем, аўтар першага «Руска-беларускага тлумачальнага слоўніка медыцынскіх тэрмінаў», а герой яго апавядання, адзначанага сёлета, у 1990-х расследуе справу абрабавання князя Фелікса Юсупава стагадовай даўнасці.

Вядучы конкурса, **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», паэт, пісьменнік, перакладчык Алесь БАДАК,** такім чынам характарызуе гэты конкурсны сезон:

— Было чакана, што ў 2020 год, юбілейны год Перамогі, нам дашлюць шмат апавяданняў, так ці інакш звязаных з падзеямі вайны. Тым больш цікава, што гэта ў асноўным аўтары, якія нарадзіліся пасля вайны, а мне асабіста заўсёды хочацца бачыць, як новыя пакаленні асэнсоўваюць тыя падзеі, што адлюстраваны ў творах Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Алеся Адамовіча ды іншых класікаў. Заўсёды радуе, калі ў конкурсе ўдзельнічаюць не толькі пачаткоўцы, але ўжо і вопытныя празаікі. Гэты сезон пацвердзіў, што конкурс «Звязды» цікавы не толькі тым, хто робіць у літаратуры першыя крокі, але і вядомым літаратарам. Спадзяюся, што і ў наступныя гады прызнаныя майстры слова будуць браць удзел у гэтым конкурсе і дадуць пачаткоўцам майстар-клас на старонках газеты «Звязда». Прыемна кожны год адкрываць новыя імёны. Я ведаю, што чакаць ад нашых прафесіяналаў, я ведаю іх стыль, і радасна раптам сустрэць нечаканы почырк аўтара, пра якога раней не чуў, але адгэтуль будзеш яго пазнаваць. Я хацеў бы звярнуць увагу чытачоў на Хрысціну Курчанкову, якая ўпершыню стала лаўрэатам «звяздоўскага» конкурсу, — мне здаецца, мы яшчэ пачуем пра гэтую пісьменніцу з арыгінальным, вельмі вобразным стылем. А вось іншы лаўрэат, Віктар Варанец, ужо добра нам знаёмы. Ён неаднойчы рабіўся лаўрэатам «звяздоўскага» конкурсу. Запомніўся мне тым, што кожны год спрабуе сябе ў розных жанрах — і гістарычнае апавяданне, і дэтэктыў, і фэнтэзі. Сёлета я нават па прачытанні яго аповеду знайшоў у сецыве мемуары князя Юсупава, каб зразумець мяжу паміж аўтарскім вымыслам і фактамі.

Вядучы конкурса слушна заўважыў, што кожны год дасланыя творы паказваюць зрэз сучаснай беларускай літаратуры, дзе кожны можа знайсці нешта на свой густ.

Вынікі падведзеныя, мы шчыра віншуем лаўрэатаў, якіх чакаюць прыемныя падарункі ад рэдакцыі і выдавецтва «Мастацкая літаратура». Спадзяёмся, што, нягледзячы на складаную эпідэміялагічную сітуацыю, мы зможам сустрэцца і ўручыць іх. І, загадзя адказваючы на пытанне, якое абавязкова ўзнікла ў нашых чытачоў, гаворым: конкурс апавяданняў «Звязды», які мае шматгадовыя традыцыі, будзе працягвацца! Літаральна ў заўтрашнім нумары чытайце пра ўмовы наступнага сезона.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Кніжны гасцінец

# ПРАЎДА ПРА ВАЎКАЛАКАЎ І КАСЦЯНУЮ НАГУ

**Валерый Гапееў. Зніч ваўкалака. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2020**




Падлеткі — самая складаная чытацкая аўдыторыя, таму што з абвостраным пачуццём справядлівасці і юнацкім максімалізмам... Ды і гаварыць з імі на іх мове, шчыра быць на іх баку — не кожны дарослы можа... Валерый Гапееў у чарговы раз давёў, што яму гэта ўдаецца. На гэты раз сучасныя беларускія тынэйджары сустрэнуцца на старонках яго твора з беларускай міфалогіяй... Прыехаў гарадскі хлопец Стась на бацькоўскае лецішча — бацькі ў Турцыю адправіліся, а за градамі ж трэба прыглядваць... Пазнаёміўся з мясцовым равеснікам Віталём і дзяўчынай Янінай... А ў вёсцы якраз вэрхал: чупакабра аб'явілася — альбо, як пераканаўя вясковыя бабулькі, ваўкалак: курэй дзярэ, коз... А тут і студэнтачка знікла з фальклорнай экспедыцыі... І ці не на балоты вядуць сляды? Вядома, моладзь актыўна ўключаецца ў разгадку таямніц і пошукі зніклай дзяўчыны: яны ж, зразумела, больш апантаныя, адважныя і кемлівыя, чым дарослыя, якія не вераць усялякім казкам... Ненавязліва, але вельмі захапляльна аўтар пагружае чытачоў у гісторыю народнай міфалогіі, усведамляючы, што ў кожнай казцы зашыфравана шмат важнай інфармацыі... Вядома, многія, чытаючы пра блуканні герояў па беларускіх балотах і здзіўляючыся іх майстэрству выжывання, успомняць «Палескія рабінзонаў» Янкі Маўра. Але гэта толькі адзін пласт твора... А разгадка будзе такая, што прымусіць успомніць ледзь не «Ваўчыную яму» Васіля Быкава. Свет перад героямі-падлеткамі паўстае ва ўсёй сваёй шматколернасці і багацці праблематыкі, адбываецца сутыкненне паміж беспакараным злом і ідэалістычнай патрэбай у справядлівасці. Любы можа трапіць у тую ж сітуацыю, што і Стась: карыстаючыся тым, што хлопец бянтэжыцца перад прывабнай дамай, яго рабуюць... Што цяпер? Зазлаваць на ўвесь свет? На прыгожых жанчын? Не, лепей пераступіць і жыць далей, з тымі, хто разумее і не здрадзіць. Вядома, вялікая ўвага — адносінам дарослых з падлеткамі. Чамусьці дарослыя пераканаўя, што былі разумнейшыя, а галоўнае, больш маральныя за «пакаленне смартфонаў». Бацька Стася, убачыўшы, што той вядзе на іх лецішча прыгажуню Яніну, прамаўляе розныя брыдкасці. Разбэшчаная, маўляў, моладзь... Яму і ў галаву прыйсці не можа, што сын заняты высакароднай, самаахвярнай справай і нават падумаць непрыстойна пра дзяўчыну, да якой узніклі першыя пачуцці, сароммееца... Валерый Гапееў умее ненавязліва ўплесці ў сюжэт вельмі значныя для беларускай праблемы. Напрыклад, Янінка даведваецца пра свае шляхецкія карані — яе продкаў рэпрэсіравалі, саслалі... І блізкія баяліся нават згадваць пра гэта. Ці вось яшчэ — юныя героі вырашаюць дылему: праслявіцца праз абнародаванне сваіх адкрыццяў пра старажытнае капішча з цудадзейным знічам альбо прамаўчаць і тым самым захаваць ад хцівых людзей народную святыню?

**Уладзімір Проп. Гістарычныя карані чарадзейнай казкі. Масква, «Азбука-классика», 2020**

Гэтую кнігу павінен прачытаць кожны, хто падазрае, што казка — хітра зашыфраванае пасланне ад продкаў. Уладзімір Проп — расійскі філолаг, які казаў




пра сябе: «Мне трэба было быць біёлагам. Я люблю ўсё класіфікаваць і сістэматызаваць». Кніга выйшла ў свет упершыню ў 1946 годзе, і хоць аўтар, а родам ён з паволжскіх немцаў, дзеля выратавання сябе і сваёй работы ў кантэксце панавання сацрэалізму згадвае Леніна, быў абвінавачаны ў антымарксізме, «перакручванні і фальсіфікацыі сапраўднай гісторыі грамадскіх зносін». Але да сёння работы Пропа з'яўляюцца базавымі для ўсіх даследчыкаў міфалогіі. А звычайны чытач? Згадзіцеся, захапляльна расшыфроўваць патаемныя сэнсы ў тым, што добра знаёма з дзяцінства.

Напрыклад, шмат у якіх казках героя зашываюць у скуру каровы ці каня, каб затым ён выбраўся з ямы альбо адправіўся ў «трыдзясятае царства». Насамрэч гэта водгулле звычаю зашываць у скуру нябожчыкаў. Вядома, надае каштоўнасці рабоце тое, што Проп не толькі выкарыстоўвае ў якасці матэрыялу рускія казкі, але цытуе і сусветную міфалогію. Шмат у якіх казках свету прыхаванае табу, якое датычылася цара і яго дзяцей, альбо вярхоўнага жраца: не пакідаць палаца, не бачыць сонечнага святла, не дакранацца нагой да зямлі. Шмат у якіх казках зашыфраваныя ўяўленні нашых далёкіх продкаў пра той свет. Калі герою трэба знасіць жалезныя чаравікі, сцерці жалезны посах, перш чым дайсці да мэты, — гэта абавязкова пра падарожжа памерлага, якому ў труну клалі асабліва трывалы абутак. Ну а сустракаецe згадку пра лес — гэта і месца ініцыяцыі ў дарослае жыццё, і пагранічча са светам мёртвых. Шмат у якіх народаў — што ў Афрыцы, што ў Паўднёвай Амерыцы, што ў Новай Гвінеі, доўга захоўваўся звычай ініцыяцыі, калі бацька адводзіць сына ў лес, дзе той павінен знайсці ці пабудаваць пункт — «чароўную хатку», і тым пацвердзіць сваю дарослась. Усё можна знайсці ў казцы — і абрад пасвячэння ў шаманы, і сувязь з татэмам — менавіта пра гэта і Каток — Залаты Лабок, і Крошачка-Хаўрошачка з яе каровай... Карацей, чытайце кнігу, а пасля нанова асэнсоўвайце чарадзейныя беларускія казкі.

Выданні для агляду прапанаваны крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.51 | 17.57 | 9.06 |
| Віцебск — | 8.45 | 17.42 | 8.57 |
| Магілёў — | 8.41 | 17.47 | 9.06 |
| Гомель — | 8.32 | 17.49 | 9.17 |
| Гродна — | 9.05 | 18.13 | 9.08 |
| Брэст — | 9.01 | 18.18 | 9.17 |

### Месяц

*Апошняя квадра ў 20.38. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

***Пр.** Гаўрылы, Георгія, Івана, Макара, Мікалая, Пятра, Цімафея, Якава.*
***К.** Веранікі, Андрэя, Юзафа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Калі вам ад мяне нічога не трэба, то мне для вас нічога не шкада.**

— Я ўжо выйшла з ванная і чакаю непрыстойных прапаноў!

— А давай заправім аліўе кетчупам?!

— Не, гэта ўжо перабор!

**— Артур, прыйдзеш да мяне на вяселле?**

**— Чаму б і не...**

**— Цудоўна, з жаніхом пытанне вырашана!**

— Чаму ты за сабой не сочыш?

— А я сябе ні ў чым не падазраю!



## Даты | Падзеі | Людзі

### 4 ЛЮТАГА

**У краіне**

**1746** год — нарадзіўся Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка (колішні фальварак Мерачоўшчына, цяпер Івацэвіцкі раён), палітычны і ваенны дзеяч, кіраўнік паўстання 1794 года ў Польшчы, Літве і Беларусі, генерал-лейтэнант.



**1921** год — нарадзіўся (вёска Дурынічы, цяпер Ізюмава, Бабруйскі раён) Мікалай Рыгоравіч Пінчук, Герой Савецкага Саюза, заслужаны лётчык-выпрабавальнік СССР. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1942 года на Заходнім і 3-м Беларускім франтах. Удзельнік вызвалення Смаленшчыны, Беларусі, баёў ва Усходняй Прусіі. Быў камандзірам знішчальнай авіяэскадрыллі, за час вайны здзейсніў 307 баявых вылетаў, збіў 22 варожыя самалёты. Аўтар кнігі «У паветры — «Які».

**У свеце**

**1851** год — нарадзіўся Сяргей Мікалаевіч Нікіцін, рускі гідрагеолаг і палеантолаг, член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук. Адзін з арганізатараў гідрагеалагічных даследаванняў у Расіі.

**1876** год — нарадзіўся Віктор Жан Урольс, бельгійскі кампазітар, скрыпач і дырыжор, член Каралеўскай бельгійскай акадэміі. У 1906—1926 гадах дырэктар Люксембургскай кансерваторыі.

**1881** год — нарадзіўся Клімент Яфрэмавіч Варашылаў, дзяржаўны, партыйны і ваенны дзеяч. Удзельнік трох рэвалюцый у Расіі, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы.

У гэты ж дзень нарадзіўся Якаў Аляксандравіч Пратазанаў, савецкі кінарэжысёр, адзін з пачынальнікаў расійскага кінематографа.



**1901** год — нарадзіўся Аляксандр Верт, англійскі публіцыст і журналіст. У гады Другой сусветнай вайны быў карэспандэнтам шэрагу англійскіх газет і Бі-бі-сі ў СССР. Аўтар кніг «Расія ў вайне. 1941—1945», «Францыя. 1940—1955».

**Так гаварыў...**

**П'ЕР РАНСАР:**

*«Няшчасны ўладар, які прыблізіў лісліўца».*


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 350.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 лютага 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12